WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 207
(26815)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Паралелі

## БЕЛАРУСЫ АДЧУВАЮЦЬ «КАМУНАЛКУ» МЕНШ, ЧЫМ ЕЎРАПЕЙЦЫ

Паводле звестак выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, летась беларускія сем'і выдаткоўвалі на аплату жыллёва-камунальных паслуг, вады і электрычнасці 9,9 працэнта сваіх даходаў. Гэты паказчык аказаўся практычна ўдвая ніжэйшым, чым у большасці краін Еўропы. У прыватнасці, падобны артыкул у Літве «забіраў» 12,3, у Латвіі — 17,9, Чэхіі — 18,8, Германіі — 19,4, Францыі — 19,9, Польшчы — 20,3 працэнта даходу сярэдняй сям'і.

Такі малюнак перш-наперш стаў вынікам рэгулявання тарыфаў для насельніцтва. У выніку ў параўнанні з суседнімі краінамі адрозненні становяцца значнымі. У прыватнасці, электраэнергія для грамадзян у Беларусі каштуе ў 2,1 раза танней, чым у Літве і Эстоніі, ацяпленне — у 1,7 раза менш, чым у Польшчы, газ для прыгатавання ежы — у 1,5 раза менш, чым у Польшчы і ў 5,5 раза менш, чым у Літве, вада — у 1,5 раза менш, чым ва Украіне, у 7 разоў менш, чым у Польшчы, у 9 разоў менш, чым у Эстоніі і ў 16,3 раза менш, чым у Літве. Не менш цікавы і такі факт: тарыф на электраэнергію для насельніцтва ў Беларусі ў 1,1, а на ацяпленне — у 1,9 раза ніжэй, чым у багатай на ўласныя энергарэсурсы Расіі.

Дарэчы, тая ж статыстыка сведчыць, што беларусы плацяць менш не толькі за жыллёва-камунальныя, але і за транспартныя паслугі. Як вядома, кошт паездкі ў камунальным транспарце Мінска цяпер складае 700, а ў абласцях — 600 рублёў. Для параўнання: кошт паездкі ў Пензенскай і Саратаўскай абласцях Расіі адпавядае 676-770, у Кіраўскай вобласці — 962, у наземным транспарце Санкт-Пецярбурга — 1732 (у метро — 1924), наземным транспарце Масквы — 2360 (у метро — 2560), у грамадскім транспарце Вільнюса — 2250, а Варшавы — 2710 беларускім рублям у пераразліку.

**Сяргей ГРЫБ.**

Ваш зварот

## «КОЎЗКАЯ» ЗАРПЛАТА

### НІЖЭЙ БЮДЖЭТУ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ, БЕЗ АФАРМЛЕННЯ ПРАЦОЎНЫХ ДАГАВАРОЎ І АДЛЮСТРАВАННЯ Ў БУХГАЛТАРСКІМ УЛІКУ

**У сувязі са шматлікімі зваротамі грамадзян наконт парушэння суб'ектамі малога прадпрымальніцтва тэрмінаў разліку па зарплаце, Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці арганізаваў маніторынг сітуацыі па гэтай праблеме.**

Было ўстаноўлена, што на 1 ліпеня сёлетняга года ў 3160 структурах малога прадпрымальніцтва заробак складаў у эквіваленце менш за 200 амерыканскіх долараў. У тым ліку у 544 — ніжэй мінімальнай зарплаты (258,6 тысячы рублёў), у 703 — ніжэй бюджэту пражытковага мінімуму (274,5 тысячы рублёў). Гэтыя прадпрыемствы аказваюць транспартныя і цырульніцкія паслугі, ажыццяўляюць рамонт аўтамабіляў, займаюцца рознічным і аптовым гандлем.

Разам з тым, у ходзе праверак па зваротах грамадзян у Камітэт дзяржкантролю выяўленыя факты выплаты заробку без афармлення працоўных дагавароў, парушэнні інструкцыі аб парадку вядзення касавых аперацый і разлікаў наяўнымі грашовымі сродкамі ў беларускіх рублях. Акрамя таго, выплаты заробку не адлюстроўваліся бухгалтарскім улікам, чым, адпаведна, заніжалася падаткаабкладаемая база. А расходы асобных прадпрыемстваў... перавышалі атрыманыя імі даходы. Гэта сведчыць аб утойванні даходаў і прадастаўленні несапраўдных звестак у дэкларацыях аб даходах і маёмасці.

Камітэт дзяржкантролю правёў нараду ў адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна з удзелам кіраўнікоў прадпрыемстваў, дзе зарплата ніжэй пражытковага мінімуму. Пастаўлена задача да 1 снежня г. г. забяспечыць рост зарплаты работнікаў да ўзроўню не менш за 200 долараў у эквіваленце. Плануецца правесці такія нарады і ў іншых раёнах вобласці. На прадпрыемствах, якія не забяспечваюць рост рэальнай зарплаты, Камітэт дзяржкантролю правядзе кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы па вывучэнні прычын невыканання гэтай задачы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ГАРЭЗЛІВЫ ПЕРАХОД

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Удзельніцы танцавальнага гурта «Серпанцін» пры Ганцавіцкім Цэнтры дзіцячай творчасці спяшаюцца цераз вуліцу на чарговую рэпетыцыю.

### ХОЛАДНА, ВЕТРАНА, ДОЖДЖ І МОКРЫ СНЕГ

**Сёння на тэрыторыю Беларусі завітае халоднае паветра з поўначы Атлантыкі, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У суботу да нас прыйдзе чарговы атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы, які прынясе кароткачасовыя ападкі, уначы — у выглядзе мокрага снегу, удзень — дажджы. Уначы і раніцай у Брэсцкай вобласці туман, на поўначы краіны слабы галалёд. Тэмпература ўначы на суботу ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 2—10 цяпла.

У нядзелю на тэрыторыю краіны завітае крыху цяплейшае паветра з поўдня Еўропы. Будзе без ападкаў, толькі ўначы на Віцебшчыне невялікія дажджы. Раніцай месцамі туман. Тэмпература ўначы каля 0, удзень — 5—12 цяпла.

У пачатку наступнага тыдня захаваецца спакойнае, без ападкаў надвор'е. Удзень 6—11 цяпла, у Брэсцкай вобласці — да плюс 14 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



У адпаведнасці з парадкам вылічэння часу, вызначаным Пастановай Урада Рэспублікі Беларусь, 31 кастрычніка 2010 г. у рэспубліцы адмяняецца дзеянне «летняга» часу.

У сувязі з гэтым 31 кастрычніка 2010 г. у 3 гадзіны стрэлкі гадзіннікаў на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пераводзяцца на адну гадзіну назад.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество
«Сберегательный банк «Беларусбанк»,
расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 28 ОКТЯБРЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О внесении изменений в решения Общего собрания акционеров по вопросам об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 25 октября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 28 октября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – 25 октября 2010 года.**
**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 65, 218 84 73.**

УНП 100325912.

Прамая лінія

## ПРАЦОЎНАЙ ПЕНСІІ БЕЗ ПРАЦЫ НЕ БЫВАЕ







**Пенсіі, дапамогі і сацыяльныя паслугі — тэмы заўсёды актуальныя. Таму чарговая «прамая лінія» нашай газеты з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, зразумела, не абышлася без шматлікіх званкоў. Як залічваецца ў стаж навучанне ў інстытуце, ці можна мець два пенсійныя пасведчанні, на якіх умовах прадастаўляецца сацыяльнае абслугоўванне на даму — вось толькі некаторыя тэмы больш чым гадзіннай тэлефоннай размовы. Такім чынам, на пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць намеснік міністра Валянціна Вікенцьеўна КАРАЛЁВА, начальнік аддзела арганізацыі пенсійнага забеспячэння Ніна Міхайлаўна ЛУЗІНА і начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Іван Пятровіч НАГІБІН.**

☎ ***— Патлумачце, калі ласка, як залічваецца ў стаж навучанне ў інстытуце? І другое пытанне. Паміж звальненнем і ўладкаваннем на новае месца я не працавала месяц. Ці пойдзе ён у стаж?***

**Фаіна Аронаўна ЖУРАЎЛЁВА**, *г. Мазыр*

— У стаж залічваецца навучанне на дзённым аддзяленні інстытута — з пачатку навучальнага года і да даты, калі рашэннем дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі была прысвоена кваліфікацыя.

І па другім пытанні. Стаж лічыцца з дня прыёму на працу па дзень звальнення. Адпаведна, месяц «перапынку» ў стаж не ідзе.

☎ ***— Мяне завуць Віктар Іосіфавіч Чывель, з'яўляюся інвалідам ІІ групы, але маю працяглы працоўны стаж — больш за 43 гады. Ці ёсць у сувязі з гэтым сэнс у пераходзе з пенсіі па інваліднасці на пенсію па ўзросце?***

***І яшчэ. Я жыву з жонкай-пенсіянеркай, і з намі прапісана дачка. Але фактычна дачка жыве ў Мінску. У сувязі з гэтым, ці маем мы права на льготы па аплаце жыллёва-камунальных паслуг і льготы па зямельным падатку?***

— У пераходзе з пенсіі па інваліднасці на пенсію па ўзросце, па сутнасці, няма аніякага сэнсу. Вы будзеце атрымліваць роўна столькі ж, колькі і цяпер — пенсія па інваліднасці ІІ групы і пенсія па ўзросце для вас будуць абсалютна аднолькавымі.

А цяпер наконт ільгот. Па аплаце жыллёва-камунальных паслуг яны прадстаўляюцца інвалідам, якія пражываюць адны ці з іншымі непрацаздольнымі членамі сям'і. У вас жа «прапісаная» працаздольная дачка, адпаведна, льготы тут не будзе. Што ж да зямельнага падатку, то пытанне крыху не па адрасе — у гэтым выпадку парадак прадстаўлення льгот вызначаецца мясцовай уладай. Таму, калі ласка, звярніцеся па тлумачэнні ў райвыканкам ці ў сельсавет.

***(Працяг будзе.)***

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «ПАТРЭБНЫЯ ДАВЕДКІ ВЯСКОЎЦЫ МОГУЦЬ ЗАМОВІЦЬ ПА ТЭЛЕФОНЕ. МЫ ДАШЛЁМ ІХ ПОШТАЙ»

**Бацькоўская хата мінчаніна Леаніда Паўлавіча Адзярыхі — у вёсцы Прусы Салігорскага раёна. Заяўнік распавёў наступную гісторыю і папрасіў дапамагчы атрымаць адказы на свае пытанні.**

— Раней вёска Прусы адносілася да тэрыторыі Чэпелеўскага сельскага Савета. Да канторы было кіламетры тры. Аднак потым адбылося аб'яднанне, і цяпер мы адносімся да Краснадворскага сельскага Савета. А гэта ўжо кіламетраў пятнаццаць, значыць, пехатою. Калі што — туды так проста не патрапіш. А патрэба наведаць сельскі Савет можа быць рознай. Напрыклад, каб атрымаць у горадзе той жа торф, на яго спачатку патрэбна выпісаць талон. Дзе? У сельскім Савеце. А транспарт туды не ходзіць. Ёсць аўтобусны маршрут Салігорск — Прусы, але ў Краснадворцы ён не трапляе. Чаму? І яшчэ пытанне, якое задаю, карыстаючыся выпадкам. У Прусах калісь быў клуб, які цяпер зачынены. Будынак пакрысе прыходзіць у заняпад. Глядзець на гэта балюча, бо гэта адзін з астраўкоў, у якім у вёсцы цеплілася культурнае жыццё, — расказаў нам чытач.

У Краснадворскім сельскім Савеце пацвердзілі інфармацыю і пра аб'яднанне, і пра тое, што аўтобус у Прусы пакуль не заходзіць. Потым па сутнасці пытанняў Леаніда Паўлавіча сказалі наступнае.

— Адзін раз у два месяцы праводзяцца сустрэчы з грамадзянамі. Апошні раз мы былі ў Прусах 15 кастрычніка. Ніякіх скаргаў ад насельнікаў адносна транспартнага абслугоўвання тады не прагучала. Але пра гэтую праблему ў раёне ведаюць: ужо пэўны час абмяркоўваецца варыянт, калі два разы на тыдзень аўтобус усё ж будзе заходзіць у вёску. Пакуль, наколькі вядома, канчатковае рашэнне яшчэ не прынятае. Аднак і зараз мы робім усё магчымае, каб вырашыць пытанні насельнікаў вёскі. Каб атрымаць той жа талон на паліва, пра што згадвае ваш чытач, ці даведку наконт вырашчанай сельскагаспадарчай прадукцыі, месца жыхарства і складу сям'і, дастаткова замовіць яе па тэлефоне, і потым мы дашлём паперу заяўніку поштай, — патлумачылі «Звяздзе». — Калі вярнуцца да сельгаспрадукцыі: мы ж ведаем, у каго якія ўчасткі, хто, што і колькі вырошчвае. Калі толькі будзе заяўлены які вялікі ўраджай, мы адразу зможам выехаць на месца, каб праверыць.

Што датычыцца клуба, як нам распавялі далей, дык будынак належыць мясцоваму СВК «Краснадворцы». Паводле той інфармацыі, што ёсць у сельскім Савеце, яго няма сэнсу рамантаваць, таму планавалася разабраць будынак на матэрыялы. Іх, у сваю чаргу, як раней гучала, могуць перадаць аднаму заслужанаму работніку СВК — даярцы, у якой здарылася бяда: згарэў дом.

— Клуб ёсць у суседніх з Прусамі Чэпелях. Гэта каля трох кіламетраў. Толькі каму асабліва туды хадзіць? — патлумачылі нам. — Усяго ў вёсцы пастаянна пражывае 134 чалавекі. З іх толькі 34 чалавекі працаздольнага ўзросту, яшчэ 12 — маладзейшыя за гэты ўзрост (ад 0 да 16 гадоў), астатнія 86 насельнікаў Прусаў — пенсіянеры...

**P.S.** ***На момант падрыхтоўкі адказу ў нас не атрымалася ўдакладніць у кіраўніцтва аўтапарка №1 г. Салігорска інфармацыю пра магчымы заход двойчы на тыдзень аўтобусаў у Прусы і тэрмінах пачатку дзеяння такога раскладу.***

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У НАЙБЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ЗАТРЫМАНЫЯ Ў ГРУЗІІ БЕЛАРУСКІЯ ГРАМАДЗЯНЕ БУДУЦЬ ВЫЗВАЛЕНЫ

У найбліжэйшыя дні беларускія грамадзяне, якія былі затрыманы ў Грузіі пасля наведвання Абхазіі, будуць вызвалены. Аб гэтым паведаміў, адказваючы на пытанне карэспандэнта **БЕЛТА**, **прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Андрэй САВІНЫХ**.

Паводле яго слоў, знешнепалітычнае ведамства Беларусі падключылася да вырашэння праблемы, звязанай з затрыманнем беларускіх грамадзян, адразу ж пасля атрымання інфармацыі па гэтай справе ў пачатку кастрычніка. «Намі былі арганізаваны кантакты і кансультацыі па дыпламатычных каналах з кампетэнтнымі органамі Грузіі», — сказаў афіцыйны прадстаўнік МЗС Беларусі.

«Сёння ў нас ёсць усе падставы лічыць, што пытанне будзе канчаткова вырашана ў найбліжэйшыя дні, і беларускія грамадзяне будуць вызвалены», — адзначыў Андрэй Савіных.

Ён падкрэсліў, што «грузінскі бок праявіў высокую ступень канструктывізму ва ўрэгуляванні гэтай праблемы».

Прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі звярнуў увагу на той факт, што «грузінскі бок разглядае ўезд на тэрыторыю Абхазіі з любой іншай тэрыторыі, акрамя тэрыторыі самой Грузіі, як крымінальнае злачынства, якое ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Грузіі караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад 2 да 4 гадоў».

Як паведамлялі раней інфармагенцтвы, тры тыдні таму сям'я з Брэста, якая ажыццяўляла паломніцтва па святых мясцінах, была затрымана ў Грузіі.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МЭР МАСКВЫ СЯРГЕЙ САБЯНІН УСТУПІЎ У ПАСАДУ



Сяргей Сабянін, зацверджаны ў чацвер удзень Масдзярждумай на пасаду мэра расійскай сталіцы, заняў пасаду на пяцігадовы тэрмін. Цырымонія пачалася з урачыстых фанфар і дзяржаўнага гімна Расійскай Федэрацыі. Сабянін прынёс прысягу мэра: «Клянуся пры ажыццяўленні паўнамоцтваў мэра Масквы выконваць Канстытуцыю Расійскай Федэрацыі, федэральнае заканадаўства, статут і законы горада Масквы. Добрасумленна выконваць ускладзеныя на мяне абавязкі, служыць працвітанню горада і дабрабыту яго жыхароў». Старшыня Масдзярждумы Уладзімір Платонаў на афіцыйнай цырымоніі інаўгурацыі сказаў, што, пасля таго, як Сабянін прачытаў тэкст прысягі, ён афіцыйна стаў мэрам Масквы.

### ВА УКРАІНЕ ВЫЯВІЛІ ФІНАНСАВЫЯ ПАРУШЭННІ НА 6,6 МЛРД ДОЛАРАЎ

Праверка, праведзеная галоўным кантрольна-рэвізійным упраўленнем Украіны, знайшла ў дзейнасці прадпрыемстваў краіны фінансавыя парушэнні на 53 млрд грыўняў (6,66 млрд долараў). Пра гэта заявіў кіраўнік упраўлення Пётр Андрэеў, паведамляюць інфармагенцтвы. Паводле яго слоў, з пачатку года КРУ праверыла 10 700 украінскіх прадпрыемстваў і выявіла факты парушэнняў фінансава-бюджэтнай дысцыпліны на 94% з іх. Гаворка, у прыватнасці, ідзе пра раскраданне бюджэтных сродкаў. Праверка пацвердзіла факты татальнай карупцыі, якая прасочвалася ва ўсіх сферах эканомікі Украіны, адзначыў кіраўнік упраўлення.

### ПАРЛАМЕНТ РУМЫНІІ ПАМЫЛКОВА ЗНІЗІЎ ПАДАТКІ

Дэпутаты парламента Румыніі памылкова прагаласавалі за закон аб зніжэнні падатку з продажу прадуктаў харчавання на 5%, паведамляюць інфармагенцтвы.

Блытаніна адбылася з-за таго, што парламентарыі не прачыталі як след перад галасаваннем законапраект, падрыхтаваны апазіцыяй. У ліпені гэтага года дэпутаты прагаласавалі за павелічэнне падатку з 19% да 24%.

Цяпер заканадаўцам неабходна ў тэрміновым парадку ануляваць сваё рашэнне. У той жа час міністр фінансаў Георгэ Яламіцану падкрэсліў, што пакуль памылка не выпраўленая, ураду давядзецца выконваць прыняты закон.

### У ФЕАДОСІІ Ў ПРАВАСЛАЎНЫМ ХРАМЕ АДБЫЎСЯ ВЫБУХ

У Феадосіі выбух газапаветранай сумесі пашкодзіў прыбудову да храма Усіх святых Крымскай і Сімферопальскай епархіі Украінскай праваслаўнай царквы Маскоўскага патрыярхату. Ніхто не пацярпеў. У выніку выбуху былі пашкоджаны вонкавая сцяна першага паверха, унутраная цагляная перагародка, дэфармаваныя жалезабетонныя перакрыцці на плошчы 24 кв. м, вокны і міжпакаёвыя дзверы. На капітальных сценах збудавання з'явіліся трэшчыны. У выніку выбуху таксама была пашкоджана сцяна гандлёвага павільёна на тэрыторыі рынку, які знаходзіцца паблізу.





ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.10.2010 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▼1 долар ЗША ... 3 002,00 | 1 чэшская крона ... 171,81 | USD ... 30,7348 |
| ▲1 еўра ... 4 193,19 | 1 польскі злоты ... 1065,60 | 10 UAH ... 38,6723 |
| 1 латвійскі лат ... 5 939,26 | ▲1 расійскі рубель ... 97,67 | 1000 BYR ... 10,2211 |
| 1 літоўскі літ ... 1 219,83 | 1 украінская грыўня ... 377,73 | EUR ... 42,8781 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова



АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белстройматериалы» (продавец)**

проводит очередной открытый аукцион по продаже зданий и сооружений производственного участка, расположенного по адресу: **г. Смолевичи, ул. Торговая, 20а**, в составе здания вспомогательного корпуса, об. пл. 942,3 кв.м; объектов незавершенного строительства: складской корпус (готовность 75 %), об. пл. 6246 кв.м; административно-бытовой корпус (готовность 72 %), об. пл. 635,7 кв.м; склад ГСМ (готовность 85 %), об. пл. 33,8 кв.м, контрольно-проездной пункт (3х3 м); канализационная насосная станция; очистные сооружения дождевых вод; прожекторная мачта (2 ед.); резервуары запаса воды (3 ед.); **железная дорога** (протяж. 1268,71 п.м.); ворота металлические; осветительные ж/б столбы (18 ед.); ограждение территории (275 бетонных плит); открытый склад под козловым краном (бетон. площадка); внутриплощадочные сети; внеплощадочные сети, а также оборудования.

**Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 4 083 752 556 бел. руб.**

Площадь земельного участка **9,2953 га.**

**Задаток в сумме 20 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в следующем порядке: в течение 20 дней с даты проведения аукциона оплачивается 50 % стоимости, оставшаяся сумма выплачивается в соответствии с договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.12.2009.

Аукцион состоится **29.10.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.10.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

ОАО «Белвнешэкономбанк» г. Минск, ул. Мясникова, 32

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2010 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2010 г. | на 01.10.2009 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 72792,5 | 61933,4 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 263269,9 | 116991,8 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | 269984,5 | 137480,3 |
| | для торговли | 11031 | – | – |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | – | – |
| | в наличии для продажи | 11033 | 269984,5 | 137480,3 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 215662,5 | 165447,1 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 1749895,6 | 1201123,6 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 7490,1 | 5095,3 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 85177,6 | 77241,0 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 24512,4 | 18596,1 |
| 10 | ИТОГО АКТИВЫ | 110 | 2688785,1 | 1783908,6 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 118366,0 | 818,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 561854,3 | 393284,5 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 1181372,7 | 881227,4 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 726,2 | 5803,7 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 35575,0 | 38244,0 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1897894,2 | 1319377,6 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 605017,0 | 327483,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 30584,0 | 20879,1 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 97037,3 | 61749,6 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 58252,6 | 54419,3 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 790890,9 | 464531,0 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 2688785,1 | 1783908,6 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 1156943,7 | 552184,4 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 874025,3 | 441656,1 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2010 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2010 г. | на 01.10.2009 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 203324,7 | 140142,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 68659,1 | 71227,1 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 134665,6 | 68915,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 50495,3 | 47324,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 7389,1 | 5191,8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 43106,2 | 42133,1 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20936,8 | 20782,2 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 70,6 | 29,4 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 429,5 | 1181,7 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 32933,5 | 12510,3 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 11742,7 | 12779,6 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 96615,7 | 73562,3 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 18795,7 | 16985,5 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 10561,6 | 13054,3 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 52044,9 | 29708,8 |

**Председатель Правления** **П.В. Каллаур**

**Главный бухгалтер** **З.С. Кушнерова**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.

# РАСІІ НЕАБХОДНЫ ЧАС ДЛЯ ПЕРААСЭНСАВАННЯ АДНОСІНАЎ З СУСЕДЗЯМІ

Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю газеце «Літоўскі кур'ер», апублікаваным учора, паведамляе БЕЛТА.

«Расія выступае цяпер з пазіцыі партнёрскіх — як яны прывыклі цяпер гаварыць — адносінаў. Ну і добра, давайце будзем партнёрамі. Раней яны гаварылі, што мы браты, што мы адзін народ. Хто ж гэта аспрэчвае? Беларусы і рускія — гэта адзін народ, гэта браты. Але і беларусы, і рускія маюць нейкія свае асаблівасці», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, самае галоўнае, што і беларусы, і рускія жывуць сёння ў сваіх дзяржавах, і гэта трэба ўспрымаць як данасць. «Відаць, не ўсе ў Расіі да гэтага гатовыя. Я лічу, патрэбны час, каб Расія пераасэнсавала саму сябе і пераасэнсавала адносіны з суседзямі, а тым больш з беларусамі».

«Хацелася б некаму, каб Беларусь увайшла ў склад Расіі. Таму ў Саюзнай дзяржаве нам падкідвалі не канстытуцыю прымаць, як у дагаворы запісана, а прапаноўвалі адзіную валюту ў выглядзе расійскага рубля, а эмісія грошай будзе толькі ў Расіі. Вы пагадзіліся б на гэта? Бяспраўная Беларусь і паўнапраўная Расія. Калі нешта патрэбна, бяжы пад Крэмль, стукай у дзверы або станавіся на калені штосьці выпрошваць», — адзначыў Прэзідэнт. «Навошта Расіі такая форма адносінаў з Беларуссю? Сёння ўвесь свет мае масу форм такіх адносінаў, якія ніколі не разарваць», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы таксама нагадаў, што Беларусь і Расія «абсалютна адзіныя ў бяспецы». «Мы — фарпост, як яны любяць гаварыць, на захадзе Расійскай Федэрацыі, таму што ніякіх армій, узброеных сіл у нашай Саюзнай дзяржавы і ў Расіі на захадзе няма, акрамя беларускай арміі. Мы выконваем гэтыя функцыі. Пагадзіцеся, для Расіі гэта дарагога варта. Чаму ж не ўлічваецца ваенная база і гэтак далей? Таму не трэба гаварыць, што нехта некага корміць», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ні да чаго не прывядзе разгорнутая ў расійскіх СМІ інфармацыйная вайна. «Калі вам здаецца, што нейкія агароджы трасуцца, паверце, нічога не трасецца — толькі ўражанне такое ствараецца. Тэлебачанне, падкантрольныя газеты ў Расіі паліваюць брудам Беларусь. Але нічога з гэтага не атрымаецца. Проста заганяем сябе ў кут. А адтуль будзе вельмі складана выбірацца. Але трэба будзе. Нашы людзі і расіяне прымусяць нас адтуль выбрацца», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што «ў Расіі да Лукашэнкі нармальна ставяцца, дарэчы, як і ў Літве». «Але гэта не азначае, што я прэтэндую на шапку Манамаха ў Крамлі або ў вашай літоўскай дзяржаве. Мне дастаткова ўлады ў Беларусі. Я нармальна працую. Мяне людзі паважаюць. Ды мне ўжо не да гэтага — я ўжо наеўся гэтага хлеба, далей няма куды», — сказаў ён.

«Паважаюць расіяне Лукашэнку — дык вы выкарыстоўвайце гэта. Не спрабуйце брудам панізіць яго аўтарытэт у расійскім грамадстве, тым больш што атрымліваецца ўсё наадварот. У Расіі разумныя людзі, і яны разумеюць, што адбываецца», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Гэтыя атакі — "Бацька-1", "Бацька-2", тры, чатыры, я не ведаю, глядзелі вы ці не, я не глядзеў. Мне аналіз давалі, таму што ў мяне не было часу — я ў камандзіроўках правёў гэты час. А па-другое, калі мне сказалі, аб чым там размова, дык гэта ўжо наша беларуская апазіцыя бруд гэты палівае некалькі гадоў. І сёння Расія прачнулася, узяла гэты бруд і выліла чарговы раз. Каму гэта цікава?» — сказаў Прэзідэнт. «Больш таго, гэтыя байкі прайшлі адзін круг, потым, як я чуў, яны пайшлі па другім крузе. Гэта наогул ужо смешна. А мяне папракаюць у тым, што я ўзяў паўзу, таму што мне няма чым адказаць. Я на бруд не збіраюся адказваць. Людзі разбяруцца», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца пытання прызнання Паўднёвай Асеціі і Абхазіі, то Прэзідэнт адзначыў: «Яны гавораць: "Беларусь не прызнала Асецію і Абхазію". Выбачайце, а што, Літва прызнала? Не. Але вы ж Літву так не квасіце. Казахстан і Украіна, з якімі Расія нібыта сябруе сёння, прызналі Асецію і Абхазію? Не, не прызналі. Дык чаму такое стаўленне да Беларусі? Значыць, справа не ў Асеціі і Абхазіі...»

Аляксандр Лукашэнка не бачыць пакуль адчувальных вынікаў ад «Усходняга партнёрства». На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, супрацоўніцтва ў рамках гэтага праекта прынясе карысць і Еўрасаюзу і краінам-удзельніцам, аднак пакуль якіх-небудзь сур'ёзных вынікаў ад гэтай ініцыятывы няма.

«Мы глядзім на гэты праект з пункту гледжання справы. Калі гэта выгадна для Беларусі, калі гэта выгадна ўсім членам «Усходняга партнёрства», чаму б і не, давайце супрацоўнічаць. Тым больш што нарадзілася шмат праектаў, і гэта станоўча для «УП», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Мы яшчэ раз паглядзелі на сябе, дапусцім, Украіна, Беларусь у прывязцы да цяперашніх членаў ЕС балтыйскіх дзяржаў, і мы ўбачылі, што ў нас шмат пытанняў, вырашыўшы якія мы будзем садзейнічаць развіццю нашай эканомікі. Гэта будзе пазітыўна для нашых народаў. Ну і самае галоўнае — гэта плюс для ЕС. Але пакуль ідзе нейкая цяганіна», — лічыць Прэзідэнт. «Цяпер, па-мойму, у ЕС столькі праблем, што ім не да «УП», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў гатоўнасць Беларусі працаваць «для таго, каб склалася гэта канфігурацыя супрацоўніцтва». «Мы зусім не супраць. Яшчэ раз падкрэсліваю, ёсць вялікая цікавасць, супадзенне інтарэсаў — нават кампрамісу не трэба шукаць. Таму мы будзем над гэтым працаваць. Але пакуль, каб я пералічыў нейкія адчувальныя вынікі ад гэтага «Усходняга партнёрства», сказаць не магу», — адзначыў ён.

Прэзідэнт таксама лічыць, што апошнім часам з'явіліся «насцярожваючыя сімптомы». «Напрыклад, як раней ад нас патрабавалі пэўных уступак па розных напрамках, так і цяпер нас спрабуюць паставіць у няроўнае становішча», — сказаў ён. У прыватнасці, пры фарміраванні парламенцкай асамблеі «Усходняга партнёрства» — «Еўранест» Беларусі прапанавалі ўдзел у ёй разам з парламентарыямі апазіцыі. «Добра, мы не супраць. Але і ва Украіне, і ў Грузіі, і ў Арменіі, Малдове і гэтак далей, ва ўсіх, хто з'яўляецца членамі «Усходняга партнёрства», павінна быць прадстаўлена апазіцыя. Ну а калі так, то што там рабіць апазіцыі. Гэта ж чыста парламенцкае ўтварэнне», — адзначыў Прэзідэнт.

«Гэта значыць, нас спрабуюць зноў нахіліць і прапанаваць умовы не такія, як іншым членам «УП». На што мы катэгарычна сказалі «не», і ўсе члены «УП» як адзін заявілі, што дыскрэдытацыі Беларусі не дапусцяць, там павінны быць роўныя ўмовы. І нават прадстаўнікі Грузіі (дзякуй ім) заявілі: «Мы выйдзем з «УП», калі вы будзеце патрабаваць ад Беларусі і прад'яўляць патрабаванні да нас не такія, як да ўсіх». Гэта прыклад таго, як нас спрабуюць «падстругаць», «падтачыць», «падагнаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка зноў падкрэсліў, што гэты праект не накіраваны супраць Расіі. «На гэта пытанне мы адказ атрымалі адназначны. Тут няма ніякай насцярожанасці ў тым, што гэта супраць Усходу і поўны адрыў ад Расіі і арыентацыя на Захад», — сказаў беларускі лідар. «Таму насцярожанасць наша з пункту гледжання кардынальнага змянення нашай знешнепалітычнай лініі на сённяшні дзень знята», — дадаў ён.

Беларусь разлічвае на падтрымку Літвы ў час старшынства ў АБСЕ, заявіў Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю газеце «Літоўскі кур'ер».

У наступным годзе Літва зменіць Казахстан на пасадзе старшыні гэтай арганізацыі. «Літва выстаўляе абсалютна зразумелыя і зямныя пытанні, якія хвалююць нас: энергабяспека, прыродныя кліматычныя змяненні і іншае... Мы гатовы працаваць з Літвой плячо ў плячо і падтрымліваць яе. Думаю, што гэта будзе сумесны ўклад у справу бяспекі ў Еўропе і мы ад Літвы атрымаем добрую падтрымку ў час старшынства яе ў АБСЕ».

Ацэньваючы старшынства Казахстана ў АБСЕ, Аляксандр Лукашэнка адзначыў вялікую ролю Прэзідэнта гэтай краіны Нурсултана Назарбаева ў скліканні саміту ў Астане, які назначаны на 1-2 снежня. «Адзінаццаць гадоў мінула пасля Стамбула — я памятаю гэты саміт. Ніхто не збіраўся, хоць праблем шмат. Мноства праблем: пачынаючы з ваеннай бяспекі, заканчваючы ўсімі іншымі, у тым ліку і харчовай бяспекі. Усе гэтыя пытанні трэба абмяркоўваць, і заслуга Казахстана, і, перш за ўсё, Назарбаева — я ведаю, колькі ён уклаў працы, каб сабраць гэты саміт», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

На пытанне літоўскага журналіста, ці атрымала Беларусь штосьці-небудзь ад старшынства Казахстана ў АБСЕ, улічваючы цесныя адносіны паміж краінамі, Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «АБСЕ — такая арганізацыя, дзе выпрацоўваюцца калектыўныя погляды на некаторыя пытанні, дзе прымаюцца рашэнні і гэтак далей. Гэта не фармат двухбаковых адносінаў, і наўрад ці тут Казахстан для асобнай якой-небудзь краіны змог бы штосьці зрабіць у час свайго старшынства».

Уладзімір МАКЕЙ:

# «ПА ЎЗРОЎНІ АКАЗАННЯ МЕДДАПАМОГІ РНПЦ ТРАЎМАТАЛОГІІ І АРТАПЕДЫІ БЕЛАРУСІ ЗАЙМАЕ ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў СНД»

Па ўзроўні аказання медыцынскай дапамогі і ўкараненні высокатэхналагічных метадаў лячэння РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Беларусі па праву займае першае месца ў краінах СНД. Пра гэта паведаміў учора на адкрыцці міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасныя аспекты аказання спецыялізаванай траўматолага-артапедычнай дапамогі» кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей. Канферэнцыя была прысвечана 80-годдзю РНПЦ, перадае карэспандэнт **БЕЛТА**.

Уладзімір Макей зачытаў на канферэнцыі віншавальны адрас кіраўніка дзяржавы. У ім, у прыватнасці, гаворыцца, што за 80 гадоў РНПЦ вырас у адну з буйнейшых медыцынскіх устаноў. Сёння ў цэнтры не толькі аказваецца медыцынская дапамога, але і распрацоўваюцца найноўшыя метады лячэння.

Паводле слоў Уладзіміра Макея, штогод у РНПЦ траўматалогіі і артапедыі праводзіцца каля 3,5 тыс. аперацый. Прычым больш за палову з іх адносіцца да высокатэхналагічных і складаных. Кожны год у цэнтры кансультуецца амаль 20 тыс. пацыентаў з усіх рэгіёнаў рэспублікі. Стажыроўку ў беларускай траўматалогіі і артапедыі праходзяць урачы з Расіі, Узбекістана, Кітая і іншых краін. За апошнія 5 гадоў даходы цэнтра ад экспарту паслуг павялічыліся ў 14 разоў.

Як расказаў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА дырэктар РНПЦ прафесар Аляксандр Бялецкі, беларуская траўматолага-артапедычная служба апошнія гады робіць стаўку на развіццё высокатэхналагічных і малатраўматычных аперацыйных умяшанняў.

# ПРЫНЦЫП УЗАЕМНАСЦІ

## *Медыйнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі абмяркоўваюць гэтымі днямі ў Мінску прафесіяналы з абедзвюх краін*

Не эканомікай адзінай жывіцца будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Агульная гісторыя, падобны менталітэт згуртоўваюць краіны і ў гуманітарнай сферы. Абедзве дзяржавы намагаюцца стварыць адзіную інфармацыйную прастору. Свой унёсак у гэты працэс зробіць і навукова-практычная канферэнцыя *«Медыясфера Расіі і Беларусі ва ўмовах сучасных геапалітычных трансфармацый»*, якая гэтымі днямі праходзіць у Мінску. Прадстаўнічы форум арганізаваны Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі пры падтрымцы Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы і Міністэрства інфармацыі Беларусі. Абмяркоўваюць медыйныя здабыткі і праблемы ў сценах Інстытута журналістыкі БДУ — галоўнай айчыннай кузні майстроў клавіятуры і мікрафона.

— Ва ўмовах трансфармацыі геапалітычнай рэальнасці, шпаркага развіцця камунікацыйных тэхналогій сродкі масавай інфармацыі іграюць ключавую ролю ва ўсіх без выключэння сферах жыцця сучаснага грамадства, палітычных і сацыяльна-эканамічных працэсах, — падкрэсліў у сваім вітальным слове да ўдзельнікаў каньферэнцыі **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусі Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ.**

Ён адзначыў, што СМІ сёння — адзін з сегментаў айчыннага бізнэсу, якія дынамічна развіваюцца. І лічбы сведчаць пра гэта лепш, чым словы: доля недзяржаўных масмедыя перасягае дзве трацiны. Прыватны бізнэс актыўна ідзе ў сферу кабельнага тэлебачання, FM-вяшчання, акцэнтаваў кіраўнік ведамства.

— Пры гэтым мы не імкнёмся да аднамомантнага рэфармавання адносінаў уласнасці ў СМІ, абраўшы шлях паступовага эвалюцыйнага развіцця. Не так важна, якія сродкі масавай інфармацыі — дзяржаўныя ці прыватныя. Важна, каб яны былі запатрабаваныя і канкурэнтаздольныя, адпавядалі патрабаванням часу і запытам аўдыторыі, забяспечвалі канстытуцыйныя правы грамадзян на атрыманне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі.

Усяго ў Беларусі зарэгістравана 1320 друкаваных медыя. Летась агульны іх разавы тыраж склаў больш за 13 млн асобнікаў. Дзейнічае 5 агульнанацыянальных тэлеканалаў, міжнародны спадарожнікавы тэлеканал «Беларусь-ТБ». Імкліва развіваюцца кабельныя сеткі. Слых аматараў радыё песцяць 30 FM-станцый.

— Беларусь ніколі не закрывала сваю інфармацыйную прастору, ды гэта і немагчыма. І перш за ўсё для расійскіх сродкаў масавай інфармацыі, — запэўніў А. Праляскоўскі. Міністр паведаміў, што ў Беларусі распаўсюджваецца больш за 5 тыс. расійскіх газет і часопісаў, а ў сетках кабельных аператараў — больш як 60 расійскіх тэлеканалаў.

— Такую актыўную прысутнасць Расіі мы ўспрымаем як аб'ектыўны фактар. Гэта гістарычна абгрунтавана агульнымі культурна-моўнымі, духоўнымі традыцыямі, ментальнасцю нашых брацкіх народаў. У той жа час мы перакананыя, што ў інфармацыйным супрацоўніцтве дзвюх дзяржаў, якія аб'явілі пра прыхільнасць да стварэння агульнай інфармацыйнай прасторы, павінен безумоўна выконвацца прынцып узаемнасці, уліку і павагі да нацыянальных інтарэсаў кожнага з удзельнікаў інтэграцыйнага аб'яднання.

План па стварэнні адзінай інфармацыйнай прасторы рэалізуецца вось ужо на працягу трох гадоў. Вынікі яго выканання і абмяркуюць удзельнікі форуму. Дыскусія адбудзецца таксама па плане на наступную трохгодку. Міністру інфармацыі Беларусі «хацелася б, каб у гэты план увайшло як мага больш мерапрыемстваў моладзевай тэматыкі». Удзельнікі форуму мяркуюць засяродзіцца на абмеркаванні прававых праблем распаўсюджвання інфармацыі, работы па сінхранізацыі развіцця сістэмы масавых камунікацый у Беларусі і Расіі, вывучэння грамадскай думкі пра дзейнасць СМІ ў абедзвюх краінах, падрыхтоўкі кадраў.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

Прамая лінія

# ЯК СВОЙ АСАБІСТЫ КЛОПАТ

**СТАРШЫНЯ Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР правёў «Прамую лінію» з насельніцтвам вобласці. Чатыры дзясяткі жыхароў Брэста, райцэнтраў і вёсак змаглі пагутарыць з губернатарам. Такая форма зваротаў грамадзян да прадстаўнікоў улады выглядае найбольш аператыўнай і таму — дзейснай. Бо цэлы шэраг пытанняў будзе вырашаны ў найбліжэйшы час — такое ўказанне ад кіраўніка рэгіёна службовыя асобы атрымалі прама ў зале аблтэлекама, дзе праходзіў тэлефонны дыялог.**

Напрыклад, сацыяльны работнік з вёскі Тамашоўка Брэсцкага раёна пазваніла з клопатам пра лёс ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, які поўнасцю прыкаваны да ложка. Чалавеку тэрмінова патрабуецца пастаянны медыцынскі кантроль і кваліфікаваны догляд. А накіраваць яго ў дом састарэлых няма магчымасці, бо ў ветэрана ёсць працаздольны сын. Апошні п'е, не працуе, вядзе антысацыяльны лад жыцця, часам крыўдзіць бацьку, забірае грошы. Сацыяльны ж работнік не можа знаходзіцца пры хворым пастаянна. Па гэтым выпадку губернатар даручыў разабрацца на працягу тыдня з тым, каб забяспечыць ветэрану прыстойныя ўмовы існавання.

Яшчэ адзін зварот ад ветэрана вайны паступіў з абласнога цэнтра. Брастаўчанка Лідзія Радчанка ўзнімала праблему лячэння зроку, якая вельмі актуальная для пажылых людзей. У Брэсце няма абсталявання для правядзення некаторых аперацый на вочы, а ў сталіцы за такую аперацыю трэба плаціць больш за два мільёны рублёў. Тэлефонны абанент прасіла абласную ўладу паспрыяць аснашчэнню мясцовых медыцынскіх устаноў неабходнай тэхнікай. І вось гэта быў такі выпадак, што не спатрэбілася прызначаць адказных за вывучэнне сітуацыі, намячаць шляхі вырашэння праблемы. Шаноўнаму ветэрану патлумачылі, што да канца года ў цэнтральнай гарадской бальніцы неабходнае абсталяванне будзе запушчана ў работу. Яно ўжо закуплена, з Гомеля запрошаны доктар, які мае вопыт работы на ім.

Вельмі многа было скаргаў на работу грамадскага транспарту ў Брэсце. Апошнім часам ён стаў функцыянаваць горш, гэта заўважылі ўсе, хто карыстаецца аўтобусамі і тралейбусамі. Некаторыя маршруты скарацілі, не ўлічыўшы патрэбы людзей, якія штодня дабіраюцца на працу. Па іншых маршрутах транспарт дапускае парушэнні графіку руху. З крытыкай згадзіўся і старшыня гарвыканкама Аляксандр Палышанкоў, які прысутнічаў на «прамой лініі». Аўтары зваротаў пачулі ў адказ, што пытанне глыбока вывучаецца ў аблвыканкаме, і што ў бліжэйшы час будуць прынятыя адпаведныя рашэнні.

Як заўсёды на падобных мерапрыемствах шмат нараканняў паступіла на якасць будаўніцтва і праблемы з новым жыллём. Так галава сям'і з Баранавічаў спачатку падзякаваў Канстанціну Сумару за дапамогу ў вырашэнні жыллёвага пытання. Аказалася, бацька шасці дзяцей аднойчы быў на прыёме грамадзян, які праводзіў кіраўнік вобласці ў райцэнтры. І вось шчаслівая сям'я ўсялілася ў новы дом у красавіку. Але ліфт у тым доме да гэтай пары не ўключылі. І людзі вымушаны штодня хадзіць пешшу на ўсе паверхі. Губернатар запатрабаваў ад службовых асобаў тэрмінова ліквідаваць непарадак. Такая ж рэакцыя была і на астатнія звароты, калі людзі расказвалі, што ў новым доме цячэ дах альбо цвітуць сцены.

Вельмі балючая праблема ў горадзе звязаная з прыватнай будаўнічай арганізацыяй «Аблічча». Гараджане ўнеслі грошы, многія — усю суму, а дамы стаяць недабудаваныя. Фірма мае сур'ёзныя фінансавыя і іншыя праблемы, але ж людзі, што чакаюць жыллё, не вінаватыя. Канстанцін Сумар запэўніў тэлефонных абанентаў, што ўлада трымае на кантролі гэтае пытанне і людзі не будуць пакінутыя сам-насам з праблемай.

Паўстала пытанне і з грэчкай падчас размовы старшыні аблвыканкама з людзьмі. Чалавек, які хварэе на дыябет, сказаў, што мае патрэбу ў пастаянным ужыванні гэтага прадукта. А ў многіх гандлёвых установах Брэста грэчка прадаецца па 8-9 тысяч рублёў, у той час, паводле інфармацыі тэлефоннага абанента, у Мінску і Гомелі яна намнога таннейшая. Тут ужо чыноўнікі ад гандлю атрымалі на арэхі з патрабаваннем навесці парадак з цэнамі.

Былі і спецыфічныя пытанні. Так, брастаўчанка не змагла скарыстацца сваімі чэкамі «Жыллё» пры пагашэнні крэдыту на будаўніцтва, бо пры выпісцы названых чэкаў ёй пераблыталі літару. У прозвішчы Качанава пасля «к» напісалі «о,» а патрэбна «а». Банк не прызнаў дакумент сапраўдным і адмовіўся яго прымаць. Яна ўжо выхадзіла па многіх кабінетах, але марна. Жанчыне паабяцалі дапамогу. Тут ад сябе магу дадаць: выпісвалі б дакумент на роднай мове, ніякіх памылак не нарабілі б.

У шэрагу званкоў-скаргаў быў зварот ад вельмі сталага чалавека, які парадаваў суразмоўцу на гэтым канцы провада сваім неабыякавым стаўленнем да выгляду горада. Чалавек станоўча ацэньваў работу па добраўпарадкаванні бульвара Касманаўтаў, але падзяліўся думкай наконт таго, чаму яна ідзе так марудна. Паводле назірання ветэрана, будаўнічыя брыгады надта часта наладжваюць сабе перакуры. Губернатар паабяцаў, што асабіста паназірае за работай будаўнікоў.

Падводзячы вынікі сваёй размовы, Канстанцін Сумар сказаў журналістам: «Мы працуем не ад «прамой лініі» да «прамой лініі», а штодзённа і стараемся на месцах вырашаць праблемы». Намаганні не застаюцца марнымі, пра гэта сведчыць і характар апошняга дыялогу. Інтэнсіўнасць званкоў паменшылася, апошнія дзесяць хвілін з адведзеных дзвюх гадзін не было ахвотных выкладаць скаргі. Губернатар дакладна акрэсліў сваю пазіцыю ў адносінах да чыноўнікаў: «Калі ты жывеш побач з людзьмі, павінен успрымаць клопат любога чалавека як свой асабісты — тады будзе менш і скаргаў, і крыўдаў наогул.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ААН АКАЖА БЕЛАРУСІ Ў 2011—2015 ГАДАХ ДАПАМОГУ Ў МЭТАХ РАЗВІЦЦЯ

**РАМАЧНАЯ праграма ААН па аказанні дапамогі Рэспубліцы Беларусь у мэтах развіцця на 2011-2015 гады была падпісана ўчора ў Мінску. У ганаровай цырымоніі падпісання прынялі ўдзел міністр эканомікі Рэспублікі Беларусі Мікалай СНАПКОЎ і прадстаўнік ААН у Беларусі Антоніус БРУК, а таксама кіраўнікі агенцтваў сістэмы ААН у Беларусі і прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса.**

Рамачная праграма ААН прадугледжвае пяць стратэгічных сфер у межах мандата ААН, якія найбольш поўна адпавядаюць ключавым нацыянальным прыярытэтам. Гэтыя сферы вызначаюць накірункі і дзеянні па аказанні садзейнічання развіццю ў галінах устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця, нацыянальнай сістэмы аховы здароўя, экалагічнай устойлівасці, нацыянальнай сістэмы кіравання міграцыяй у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і дзяржаўнага кіравання.

Як адзначыў Антоніус Брук, гэта першы такі дакумент для Беларусі, сумесная праца над якім працягвалася каля года:

— Я хацеў бы падкрэсліць, што Рамачная праграма ААН уяўляе платформу для сумеснай працы. Варта адзначыць, што ААН мае абмежаваныя рэсурсы для рэалізацыі сваёй дзейснасці ў Беларусі, аднак з тых часоў, калі мы адкрылі прадстаўніцтва ААН у Беларусі, то даказалі, што з'яўляемся надзейнымі партнёрамі для нашых донараў і партнёраў, а таксама для народа і ўрада Рэспублікі Беларусь. Па розных ацэнках, агульны аб'ём аказанай дапамогі Беларусі з боку ААН склаў 20—30% ад агульнай тэхнічнай дапамогі, у той час, як гэты агульны паказчык па свеце складае 5—10%.

У сваю чаргу, Мікалай Снапкоў адзначыў, што Беларусь, як адна з краін-заснавальніц ААН, надае пільную ўвагу пашырэнню супрацоўніцтва з гэтай міжнароднай арганізацыяй, і адзначыў, што не так важная сума грошай, колькі перададзены вопыт:

— З моманту набыцця незалежнасці Рэспублікай Беларусь сумесна з арганізацыямі і ўстановамі ААН было рэалізавана праектаў на суму больш за 700 мільёнаў долараў. Гэта складае больш за палову ад аб'ёму афіцыйнай дапамогі ў мэтах развіцця, якая была прадстаўлена нашай краіне. Але не так важныя тыя фінансавыя рэсурсы, як вопыт і веды, перададзеныя нашай краіне, каб мы маглі паспяхова супрацьстаяць знешнім пагрозам і вырашаць унутраныя праблемы.

Міністр эканомікі адзначыў, што, нягледзячы на цяжкае фінансавае становішча, Рэспубліка Беларусь прыкладзе ўсе намаганні па пашырэнні суфінансавання праектаў ААН у рамках гэтай праграмы і за яе межамі. Дарэчы, аб'ём фінансавання гэтай Рамачнай праграмы ААН на 2011—2015 гады — 490 мільёнаў долараў. Разам з тым Мікалай Снапкоў адзначыў, што задаволены гібкасцю распрацаванай Рамачнай праграмы ААН па аказанні дапамогі Беларусі:

— Я мяркую, што пры неабходнасці мы зможам мяняць або нейкім чынам інтэрпрэтаваць тыя ці іншыя напрамкі праграмы, зыходзячы з важнасці і найбольшай эфектыўнасці для краіны. З пункту гледжання шаблонаў, я заўсёды лічыў, што мы павінны дзейнічаць так, як дзейнічалі краіны, якія прайшлі мадэрнізацыю ў 60-80-х гадах: павінны разумець і вывучаць чужы вопыт, слухаць замежных кансультантаў. Але прымаць рашэнні мы павінны самі, зыходзячы з існуючых умоў у краіне, з ментальнасці нашай краіны, з эканамічных магчымасцяў і жадання, — перакананы Мікалай Снапкоў.

Беларусь можа прыняць умовы Расіі аб адмене пошлін на нафту пры ўмове вяртання ёй пошлін на нафтапрадукты. Аб гэтым заявіў учора журналістам міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў.

«Як мы можам не згадзіцца, калі ў аснове гэтай тэмы — роўныя ўмовы гаспадарання», — сказаў міністр. Паводле яго слоў, «гэта і ёсць тое, да чаго мы імкнёмся». Размова ідзе аб роўных умовах гаспадарання з пункту гледжання ўваходу нафты і выхаду нафтапрадуктаў для беларускіх і расійскіх нафтаперапрацоўчых заводаў.

На думку міністра, «жыццё паказала: Беларусь правільна зрабіла, што мадэрнізавала нафтаперапрацоўку» з пункту гледжання глыбіні перапрацоўкі нафты. Пры гэтым ён падкрэсліў, што па пытаннях нафтавых пошлін цяпер ідзе перагаворны працэс.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Факт

### Кантрабандная плынь не заканчваецца

Брэсцкія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні і міліцыі затрымалі буйную партыю трыкатажу.

Каля прапускнога пункта «Макраны» ў жыхара Гродна канфіскавалі 11 сумак з трыкатажна-панчошнымі вырабамі на суму 40 млн рублёў.

А вось маларыцкія міліцыянеры ў машыне жыхара Маларыты выявілі 25 буйнагабарытных сумак з імпартным адзеннем. Дакументаў на тавар не было.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### Зладзеі спакушаюцца цацкамі

З кватэры ў Гомелі выкрадзены электрааўтамат для гульні ў «страйкбол». Гаспадар, які вярнуўся дадому бліжэй да ночы, пабачыў, што замкі ў дзвярах пашкоджаныя і няма прылады для любімай камп'ютарнай забавы. А ў Жлобіне, дзе вялікая колькасць жыхароў горада займаецца вытворчасцю мяккіх цацак, з легкавой машыны было выкрадзена 40 «пушысцікаў». Непрацуючага грамадзяніна, які скарыстаўся тым, што акно ў «Мерседэсе» было адчынена, знайшлі разам з лёгкай і мяккай здабычай. А вось злодзея, які абчысціў будаўнічы вагончык на стадыёне ля ДЮСШ-2 у Калінкавічах, дзе захоўвалася 6 тэлефонных апаратаў «Лес», 15 абаненцкіх гучнагаварыльнікаў «Бярэсце-303», гідраўзмацняльнік, ДВД-прайгравальнік і многае іншае, на суму больш за 7 млн рублёў, пакуль шукае міліцыя. Між іншым, тэрыторыя стадыёна і вагончык вартавымі не ахоўваюцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### У аварыі траўмаваныя два пасажыры і пашкоджана восем транспартных сродкаў

**Такія наступствы дарожна-транспартнага здарэння ў Гродне. Чуткі аб шматлікіх ахвярах не адпавядаюць рэчаіснасці, сцвярджаюць у абласной Дзяржаўтаінспекцыі.**

Прычына ДТЗ пакуль дакладна не высветлена, бо вадзіцелі маршрутных транспартных сродкаў далі супярэчлівыя паказанні. Але сітуацыя наступная. Тралейбус 6-га маршруту рухаўся па праспекце Касманаўтаў з боку аўтавакзала. А вадзіцель 20-га аўтобуса, рухаючыся ў супрацьлеглым кірунку, збіраўся павярнуць з вуліцы Лідскай налева. На рэгуляваным скрыжаванні адбылося сутыкненне, пасля чаго вадзіцель тралейбуса, паводле яго слоў, упаў з сядзення. А тралейбус па інерцыі прадоўжыў рух, выехаўшы на сустрэчную паласу праспекта. У выніку было пашкоджана шэсць аўтамабіляў, што стаялі ў два рады перад скрыжаваннем. Што ж датычыцца тралейбуса, то ён заехаў на газон і ўрэзаўся ў дрэва.

Вадзіцелі транспартных сродкаў не пацярпелі. Шпіталізавалі 53-гадовую пасажырку тралейбуса, а другая, 26-гадовая, пакінула траўмапункт пасля аказання медыцынскай дапамогі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# НАБЫВАЙ «ЛЕГЕНДУ ПРА ЧАРАПАХУ»!

Як паведамілі «Звяздзе» ва Упраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі, 22 кастрычніка 2010 г.г. банк выпускае ў абарачэнне памятныя манеты «Легенда пра чарапаху» серыі «Беларускія народныя легенды»: сярэбраную — наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 33,62 г; медна-нікелевую — наміналам 1 рубель, масай 15,50 г.



# У БЕЛАРУСІ ЗМЕНЕНЫ ПАРАДАК УСТАНАЎЛЕННЯ НАДБАВАК БЮДЖЭТНІКАМ ЗА НАЯЎНАСЦЬ КВАЛІФІКАЦЫЙНЫХ КАТЭГОРЫЙ

У Беларусі зменены парадак устанаўлення надбавак за наяўнасць кваліфікацыйных катэгорый спецыялістам бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, што атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый. Аб гэтым **БЕЛТА** паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Як адзначыў начальнік упраўлення працы ў бюджэтнай сферы міністэрства Аляксандр Сяроў, адпаведная пастанова Мінпрацы і сацабароны ўступіла ў сілу з кастрычніка бягучага года. Ён растлумачыў, што да яе прыняцця кіраўнікам бюджэтных арганізацый асобных галін (аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізічнай культуры і спорту, сацыяльнай абароны, тэлебачання і радыёвяшчання, дзяржаўных архіваў і архіўных устаноў) было прадастаўлена права ўстанаўліваць надбаўкі ў памерах 15-30 працэнтаў ад тарыфных ставак (акладаў) спецыялістам, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі. Пры гэтым пераліку пасад спецыялістаў, якім маглі быць устаноўлены названыя надбаўкі, і парадак іх устанаўлення заканадаўча вызначаны не былі.

На практыцы надбаўкі за кваліфікацыйныя катэгорыі ўстанаўліваліся спецыялістам, пасады якіх адпавядаюць асноўнаму віду дзейнасці названых бюджэтных арганізацый: урачам, настаўнікам, бібліятэкарам і г.д. Бухгалтарам, эканамістам, юрыстам, інжынерам і іншым спецыялістам, пасады якіх маюць міжгаліновы характар, а таксама спецыялістам арганізацый іншых галін (ветэрынарная сетка, арганізацыі гідраметэаралогіі і г.д.) надбаўкі не ўстанаўліваліся.

Цяпер вызначана, што спецыялістам бюджэтных арганізацый, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі, устанаўліваюцца надбаўкі да тарыфных ставак (акладаў) у наступных памерах: за вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю — 30 працэнтаў ад тарыфных ставак (акладаў), за першую кваліфікацыйную катэгорыю — 20 працэнтаў, за другую кваліфікацыйную катэгорыю — 15 працэнтаў.

Гэта норма распаўсюджваецца на ўсе арганізацыі (структурныя падраздзяленні), у якіх прымяняюцца агульныя для работнікаў бюджэтных арганізацый умовы аплаты працы. Так, надбаўкі за кваліфікацыйныя катэгорыі ўстанаўліваюцца, у прыватнасці, спецыялістам арганізацый гідраметэаралогіі, ветэрынарнай сеткі, цэнтралізаваных бухгалтэрый, груп цэнтралізаванага гаспадарчага абслугоўвання арганізацый адукацыі і арганізацый культуры і г.д. Гэта норма распаўсюджваецца на пасады спецыялістаў, па якіх у адпаведнасці з кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, што змяшчаюцца ў адпаведных выпусках Адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых, прадугледжана кваліфікацыйнае катэгараванне.

Прынятая норма мае імператыўны характар: калі раней кіраўнік бюджэтнай арганізацыі меў права на ўстанаўленне спецыялісту надбаўкі за кваліфікацыйную катэгорыю, аднак мог не рэалізаваць гэтае права, то цяпер гэта надбаўка ўстанаўліваецца ў абавязковым парадку.

Па агульнаму правілу надбаўка ўстанаўліваецца спецыялісту з улікам прысвоенай яму кваліфікацыйнай катэгорыі і займаемай пасады. У выпадку, калі работнік займае пасаду, якая прадугледжвае больш нізкую кваліфікацыю ў параўнанні з прысвоенай яму кваліфікацыйнай катэгорыяй, надбаўка ўстанаўліваецца па займаемай пасадзе. Напрыклад, калі ў штатны расклад арганізацыі ўключана пасада бухгалтара другой кваліфікацыйнай катэгорыі, на якую прымаецца спецыяліст, які мае першую кваліфікацыйную катэгорыю, надбаўка ўстанаўліваецца ў памеры, прадугледжаным па займаемай пасадзе, г.зн. па пасадзе бухгалтара другой кваліфікацыйнай катэгорыі.

Па пасадах кіраўнікоў (намеснікаў кіраўнікоў) арганізацый, кіраўнікоў (намеснікаў кіраўнікоў) структурных падраздзяленняў, галоўных спецыялістаў, а таксама па вытворнай пасадзе «старшы» названыя надбаўкі не ўстанаўліваюцца. Напрыклад, работніку, які займае пасаду начальніка планава-эканамічнага аддзела, якому раней была прысвоена першая кваліфікацыйная катэгорыя па пасадзе эканаміста, надбаўка за кваліфікацыйную катэгорыю не ўстанаўліваецца.

Выключэнне складаюць педагагічныя, медыцынскія работнікі, асобныя катэгорыі спецыялістаў арганізацый фізічнай культуры і спорту, а таксама кіраўнікі з іх ліку, якім у адпаведнасці з заканадаўствам надбаўкі за кваліфікацыйныя катэгорыі ўстаноўлены па прысвоенай (дзеючай) кваліфікацыйнай катэгорыі.

Надбаўка за кваліфікацыйную катэгорыю вылічаецца ва ўстаноўленых працэнтных адносінах да тарыфнай стаўкі (акладу) работніка, не ўдзельнічае ў фарміраванні яго стаўкі (акладу) і на яе не налічаюцца выплаты стымулюючага і кампенсуючага характару.

Работнікам, якія выконваюць работу на ўмовах сумяшчальніцтва па асноўным месцы работы або ў іншага наймальніка, надбаўка за кваліфікацыйную катэгорыю ўстанаўліваецца ў тым жа парадку, што і асноўным работнікам.

Пры ўзнікненні дыспрапорцый ва ўзроўні аплаты працы кіраўнікоў і спецыялістаў у сувязі з устанаўленнем надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны рэкамендуе кіраўнікам бюджэтных арганізацый з улікам патрабаванняў артыкула 32 Працоўнага кодэкса прыняць меры па выключэнню названых дыспрапорцый шляхам рэгулявання памеру стымулюючых выплат, або (пры адсутнасці магчымасці такога рэгулявання) — шляхам унясення ва ўстаноўленым парадку змяненняў у штатны расклад арганізацыі. Размова ідзе аб выключэнні залішніх звёнаў у структуры арганізацыйнага кіравання, прывядзенні назваў пасад спецыялістаў у адпаведнасць са складанасцю выконваемых імі работ і г.д.

## Абзац

◢ **На планеце жыве на 57 млн больш мужчын, чым жанчын. Пра гэта гаворыцца ў новым дакладзе ААН «Жанчыны свету ў 2010: тэндэнцыі і статыстыка».**

◢ У Выбаргскім раёне Пецярбурга загінуў рабочы з Беларусі. Трагедыя адбылася на будаўнічай пляцоўцы жылога дома. 22-гадовы гастарбайтар з Беларусі зваліўся з 6-га паверха і ад атрыманых раненняў сканаў на месцы. Жыхар Магілёўшчыны ў Пецярбургу пражываў без рэгістрацыі. Акалічнасці здарэння высвятляюцца.

## Поўны абзац



◢ **Мастачка склала партрэт свекрыві з кавалкаў хлеба. Брытанская мастачка і куратар музея Лора Хэдленд склала мазаічны партрэт сваёй свекрыві з кавалачкаў хлеба, падсмажаных у тостары. На стварэнне твора пайшло каля 6 гадзін. Падчас працы мастачцы дапамагала некалькі дзясяткаў сяброў. На мазаіку патрацілі 9 тысяч 852 кавалкі падсмажанага хлеба. Атрыманы твор 27-гадовая мастачка прэзентавала свекрыві на яе 50-годдзе. Па словах імянінніцы, мазаіка зрабіла на яе вельмі добрае ўражанне. Плошча падарунка — 128 кв. метраў.**

◢ У аўстралійскім Сіднэі адкрыўся салон-цырульня для мужчын, у якім працуюць майстры выключна топлес. Ідэя адчыніць такую цырульню належыць 26-гадоваму выхадцу з Польшчы Войтэку Васілеўскаму і яго жонцы Амандзе. Па словах уладальніка незвычайнага салона, яму было даволі няпроста адшукаць дзяўчат з адукацыяй цырульніка-стыліста, якія згадзіліся б працаваць паўголымі. Пошук майстроў заняў у Войтэка 18 месяцаў. У выніку ён знайшоў чатырох цырульнікаў, што згадзіліся на яго ўмовы. Салон адчыніўся ўсяго некалькі дзён таму, аднак кліенты ўжо запісаліся на многа тыдняў наперад. «Бізнэс працвітае. Тэлефон проста разрываецца», — не хавае задавальнення прадпрымальнік.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

ЗАКУПАЕМ РАПС

**ОАО «Витебский МЭЗ»**
**производит закупку у сельхозорганизаций маслосемян рапса 1 и 2 класса, заготовленных сверх госзаказа, для собственного производства по следующим ценам:**

**1 класс – 1200 тыс. за 1 тонну без НДС.**

**2 класс – 1050 тыс. за 1 тонну без НДС.**

Транспортные расходы за счет покупателя.

Оплата в течение 10 дней с момента поставки.

**КОНТАКТЫ:**
**тел./факс 8 0212 34 16 23, тел. 8 0212 34 55 17.**

УНП 300031680.

**Управляющий в производстве по делу о банкротстве ОДО «Террастройпроект-плюс» г. Мозырь**
**ПРОВОДИТ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| № лота | Наименование объекта | Характеристика объекта | Оценочная стоимость (руб.) | Стартовая цена (руб.) | Сумма залога (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Административно-производственное здание в центре г. Мозыря | Одноэтажное, кирпичное, ж/б фундамент, площадь 254 м кв., полуподвал 265 м кв., капитальный ремонт 2008 года, площадь земельного участка 0,1837 га | 252 578 460 | 180 000 000 | 15 000 000 |

Организатор торгов: управляющий.

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

Сумма залога: до 10 % от начальной цены на р/с № 3012410630013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 401 г. Мозырь, БИК 153001749, получатель ОДО «Террастройпроект-плюс», УНП 490322936.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Форма, порядок оплаты: одноразовый безналичный платеж.

Документы, предоставляемые для участия в торгах: заявление на участие, копии платежных документов, подтверждающих внесение залога, копия устава, доверенность представителю юридического лица, паспорт физическому лицу.

Торги состоятся **16 ноября 2010 года в 14.00** по адресу: г. Мозырь, ул. Первомайская, 53Б.

Заявки принимаются **до 12.00 15 ноября 2010 года** по адресу: г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, д. 27, и а/я 20, Главпочтамт, г. Мозырь, 247760, Гомельская область.

**Справки по телефону: 8 029 663 84 96.**

# Зямля ёсць — трэба будавацца

Блізкая ўлада

**ЗЯМЕЛЬНАЕ пытанне ў нас стаіць востра. Найперш гэта датычыцца тых, хто хацеў бы атрымаць участак пад будаўніцтва. Рашэнне пытання часам зацягваецца, і гэта нервуе людзей.**

Атрымаць зямлю пад жыллё можна, але ж кожны гаспадар хоча, каб участак быў бліжэй да горада (цэнтра), каб былі падведзеныя камунікацыі, каб не было праблемы з грамадскім транспартам.... А такіх участкаў для ўсіх не хапае.

У г. п. Целяханы (Івацэвіцкі раён) зямля пад забудову ёсць, але яна патрабуе меліярацыі, а гэта значыць, што неабходна ўкласці ў асушэнне вялікія грошы. Узводзіць дом на ўчастку з высокай грунтовай вадой — справа рызыкоўная.

Па гэтым пытанні выказаўся на прэс-канферэнцыі **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР:**

*— Гэта адно з праблемных пытанняў у вобласці. Людзям пад жыллё неабходна выдзяляць прыдатныя ўчасткі, а калі ёсць патрэба прывесці зямлю ў адпаведны стан, то неабходна рабіць гэта за грошы, якія выдаткоўваюцца на інфраструктуру.*

Але сёння можна набыць зямлю і праз аўкцыён. Калі ў чалавека ёсць сродкі, то чаму б гэта не зрабіць? Аказалася, што апошнім часам цікавасць да аўкцыёну па продажы зямельных участкаў знізілася. І гэта добра відаць на прыкладзе Баранавіцкага раёна.

У 2008 годзе для індывідуальных забудоўшчыкаў было прададзена з аўкцыёну 25 участкаў на суму 301 млн рублёў, а сёлета здолелі прадаць толькі 4 участкі і атрымалі 30 мільёнаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гэтая праблема прыцягнула ўвагу **старшыні Дзяржкамітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Георгія КУЗНЯЦОВА**, які прысутнічаў на пасяджэнні райвыканкама. У чым справа? Чаму стала меней аўкцыёнаў?

*— Хіба зямля ў Баранавіцкім раёне з'яўляецца дэфіцытам? Чарга ў раёне ўсяго 117 чалавек, то няхай людзі будуюцца, — заявіў Георгій Кузняцоў.*

Людзі хочуць атрымаць участкі бліжэй да горада, дзе працуюць, а зямля, якая знаходзіцца далёка, забудоўшчыкаў мала цікавіць. У аддаленай вёсцы набыць участак можна без усякага аўкцыёну — купіў хацінку-развалюху і будуйся.

А ўся валакіта выкліканая, найперш, марудным афармленнем дакументацыі ці яе адсутнасцю. Пад індывідуальнае будаўніцтва выдзелены тэрыторыі сельскіх Саветаў, якія непасрэдна прымыкаюць да Баранавічаў, ці населеных пунктаў, што з'яўляюцца прэстыжнымі. Напрыклад, пасёлак Жамчужны знаходзіцца за 12 км ад горада, але там існуе ўся інфраструктура, і гэта прыцягвае людзей.

Зямля выдзеленая, а дакументы на ўключэнне яе ў склад земляў сельскіх Саветаў афармляюцца доўга. То там, то тут узнікаюць нестыкоўкі. А тармозяць справу архітэктары і землеўпарадчыкі, якія не могуць знайсці паразумення між сабой.

Ёсць прэтэнзіі да «Брэстгіпразема». Гэтая арганізацыя, напрыклад, узялася аформіць дакументацыю для Калпеніцкага сельскага Савета. Быў складзены дагавор, выплачаныя грошы, але праз месяц «Брэстгіпразем» адмовіўся ад дагаворных абавязацельстваў. Хоць грошы і былі вернутыя, але час не вернеш. Таму да **старшыні гэтага Савета Мікалая ГРЫБАВА** і было маё пытанне:

— Мікалай Уладзіміравіч, чым закончылася справа з «Брэстгіпраземам»?

*— Я напісаў ліст у Дзяржкаммаёмасць ды ў іншыя інстанцыі, адтуль прыязджалі прадстаўнікі і праблему ўладзілі*

— Скажыце, землі пад індывідуальную забудову сельсавету перадалі?

*— Яшчэ не, бо яны належаць сельгаскааператывам «Крошын» і «Берасні». Зямлю неабходна забраць у гаспадарак, прыняць рашэнне на мясцовым узроўні, затым раённым, а кропку паставіць вобласць, і толькі тады будуць афармляцца дакументы на зямлю. Як бачым, працэс даволі працяглы.*

— А хто будзе аплачваць тыя дакументы? Грошы вялікія?

*— Сельсавет. Напачатку нам прапанавалі зрабіць генеральны план, але за яго прыйшлося б заплаціць каля аднаго мільярда рублёў. Ад такой паслугі мы адмовіліся, і афармленне абыдзецца «малой крывёю».*

— Ахвотныя ёсць набыць участак на тэрыторыі вашага сельсавета?

*— Наш сельсавет у прыгарадзе і, вядома ж, узвесці дом у нас хацелі б многія. Няхай людзі будуюцца.*

Нашы грамадзяне за свае грошы ўзводзяць жыллё і нічога ад дзяржавы не патрабуюць, нават той лапік зямлі могуць выкупіць. То чаму б гэтых людзей не падтрымаць?

І можа, даўно настаў час разабрацца з нашымі праектнымі арганізацыямі. Старшыня Дзяржкамітэта па маёмасці на тым пасяджэнні паабяцаў праверыць работу «Брэстгіпразема». На маю думку, заслугоўвае такой увагі не толькі гэтая праектная арганізацыя.

Усё павінна быць зроблена своечасова і мець рэальную цану.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## НЕКАЛЬКІ ВІДАЎ ІМПАРТНЫХ ТАВАРАЎ, УВЕЗЕНЫХ У МІНСК, НЕ ПРАЙШЛО ДЗЯРЖАЎНУЮ ГІГІЕНІЧНУЮ РЭГІСТРАЦЫЮ

Так, у ачышчальніку шкла транспартных сродкаў вытворчасці Вялікабрытаніі перавышана ўтрыманне метылавага і ізапрапілавага спірту. Літровых бутэлек з гэтай вадкасцю аказалася больш за 2,5 тыс. штук. Не адпавядала патрабаванням і партыя дзіцячых цацак кітайскай вытворчасці: мячы з палімерных і тэкстыльных матэрыялаў мелі яўны непрыемны пах. Таксама былі выяўлены небяспечныя для здароўя чалавека рэчывы ў адной з партый гранатавага соку. У гэтым выпадку гаворка ідзе пра оксіметылфурфурол. Цяпер у сталічных імпарцёраў два шляхі: вярнуць тавары пастаўшчыкам або знішчыць.

**Любоў ЯГОРАНКАВА**, *«Мінск—Навіны»*.


## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

| Адрес участка/ кадастровый номер | ул. 2-я Белорусская, № 140100000001019335 | ул. В. Интернационалистов, 19 № 40100000001019530 | ул. В. Интернационалистов, 23 № 140100000001019531 | район индивидуальной застройки «Вычулки-Ямно» № 140100000001021585 | район ул. Коммерческая № 140100000001022617 | «ЮЗМР-4» № 18а по ГП № 140100000001022681 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № лота | 1* | 2* | 3* | 4* | 5* | 6* |
| Начальная цена продажи (руб.) | 140 622 262 | 29 756 431 | 36 301 217 | 373 957 964 | 323 312 090 | 47 824 428 |
| Сумма задатка (руб.) | 14 000 000 | 2 975 000 | 3 630 000 | 37 395 000 | 32 330 000 | 4 780 000 |
| Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | 1 450 817 | 5 795 970 | 5 810 313 | 2 636 253 | – | 755 221 |
| Общая площадь (га) | 0,8704 | 0,0673 | 0,1056 | 2,0631 | 1,7760 | 0,1234 |
| Срок аренды | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 25 лет | 10 лет |
| Целевое назначение | Строительство и обслуживание объекта производственного назначения | Строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания | Строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания | Строительство и обслуживание объекта многофункционального назначения | Строительство логистического центра | Строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров |
| Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке | 0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления | 0,0117 га – охранная зона газопровода среднего давления | Ограничений в использовании земель нет | 0,3305 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 10 киловольт; 0,2105 га – охранная зона подземных кабельных линий связи; 0,0240 га – охранная зона воздушных и кабельных линий радиофикации | Ограничений в использовании земель нет | Ограничений в использовании земель нет |

| Адрес участка/ кадастровый номер | «ЮЗМР-3» № 68 по ГП № 140100000001025057 | в районе ул. Волгоградская № 140100000001025064 | ул. Ясеневая № 140100000001025230 | р-н Южного городка № 21 по ГП № 140100000001025533 | ул. Дубровская № 140100000001025622 |
|---|---|---|---|---|---|
| № лота | 7* | 8* | 9* | 10* | 11 |
| Начальная цена продажи (руб.) | 159 669 215 | 123 706 505 | 117 896 229 | 163 241 954 | 3 333 615 |
| Сумма задатка (руб.) | 15 966 000 | 12 370 000 | 11 780 000 | 16 300 000 | 333 000 |
| Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | 1 366 583 | 1 306 845 | 1 325 567 | 1 199 309 | 1 098 560 |
| Общая площадь (га) | 0,5793 | 0,2967 | 0,3591 | 0,4439 | 0,0069 |
| Срок аренды | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет |
| Целевое назначение | Строительство и обслуживание бизнес-центра, гостиничного комплекса | Строительство и обслуживание спортивных сооружений | Строительство и обслуживание объекта торговли | Строительство и обслуживание магазина промышленной группой товаров | Установка и обслуживание павильона (оперативного модуля) для банковских услуг |
| Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке | Ограничений в использовании земель нет | Ограничений в использовании земель нет | 0,0789 га – охранная зона санитарно-защитной полосы водоводов и водопроводов; 0,0206 га – охранная зона канализационных коллекторов | Ограничений в использовании земель нет | Ограничений в использовании земель нет |

*** – повторные аукционные торги**

**Дополнительное условие по лоту № 4 –** возмещение потерь с/х производства в сумме 26 094 700 рублей, вызванных изъятием 2,0631 га пахотных земель, **по лоту № 5** – возмещение расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в т. ч. с гос. регистрацией в отношении создания земельного участка и потерь с/х производства в сумме 20 373 680 рублей

**Условия продажи:** - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение расходов, связанных с подготовкой земельно-кадастровой документации и гос. регистрации в отношении создания зем. участков, по лотам 4, 5 возмещение потерь с/х производства; - заключение с Брестским горисполкомом договора аренды зем. участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении участка гос. регистрации прав на него; - начало освоения зем. участка в течение 6 месяцев с даты проведения аукциона и подписания протокола о его результатах; - получения в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта, в срок не превышающий 2-х лет; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - снятие плодородного слоя почвы и использование его для нужд, связанных со строительством объекта и на благоустройство г. Бреста

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Перечень документов представляемый потенциальным участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; заверенную копию платежного поручения о внесении задатка; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. **Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. **Задаток в размере до 10% от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924.** Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.** Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона обязан:** ● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка; ● заключить с Брестским городским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка в установленные законодательством сроки; ● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);● по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Брестским городским исполнительным комитетом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. Оплата за объект может быть произведена в рассрочку в соответствии с порядком, утвержденным решением горисполкома. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 25 ноября 2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 22.10.2010 г. до 17.30 19.11.2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46. Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by**


Вяртаючыся да надрукаванага

# О, «РОДНЫ КРАЙ»!.. ЗАБЫЦЬ ЦЯБЕ НЕ МАЮ СІЛЫ!

**КАЛІ шчыра, прыкладна такія думкі ўзнікаюць практычна кожны год пасля таго, як даводзіцца даваць адказы на пытанні чытачоў, чаму ў продажы няма гэтага календара. Не стаў выключэннем і год сёлетні: як толькі на старонках газеты з'явіўся першы адказ на гэтае, можна сказаць, ужо традыцыйнае пытанне, на рэдакцыю абрынулася новая хваля эмацыйных лістоў.**

Нагадаем, у нумары ад 14 кастрычніка быў змешчаны матэрыял «Родны край» ужо з месяц як у продажы». Адказ у ім мы давалі на запыт Міхаіла Трафімавіча Чарняўскага з к.п. Нарач Мядзельскага раёна. Для гэтага зноў жа традыцыйна звярнуліся па каментар да намесніка міністра інфармацыі Ігара Лапцёнка, патэлефанавалі ў выдавецтва «Беларусь». Расказалі пра наклад, меркаваны сярэдні розвнічны кошт, напісалі, як вынікае з загалоўка, што каляндар ужо з месяц, як у продажы. Была там і інфармацыя пра тое, як увогуле фарміруецца наклад, парада, што трэба цікавіцца ім у продажы. Здавалася б, далі адказы на ўсе пытанні, што ўзнікалі і раней, і зараз у чытачоў. Аднак цяпер звернемся да лістоў.

Вось што, напрыклад, піша Генадзь Пятровіч Маслоўскі з пасёлка Міханавічы Мінскага раёна. «Я цалкам згодны са спадаром Чарняўскім у тым, што вельмі дрэнна абслугоўваюць беларусаў беларускімі выданнямі. У тым ліку і «Родным краем». Вы пішаце, што нібыта ён ужо паступіў у продаж. Аднак я ў верасні двойчы быў у Мінску, апошні раз 28-га. І ў цэнтральных кнігарнях (на праспекце каля «ГУМа», на К. Маркса ля ўваходу на станцыю метро «Купалаўская») я не знайшоў яго. Праўда, некалькі экзэмпляраў ляжала каля касы. Я спачатку ўзрадаваўся, але прадаўшчыца сказала, што гэта былі рэшткі календара за бягучы год, а на 2011-ы ён яшчэ не паступіў. Вы пішаце, што калі паступяць у продаж, трэба лётаць ды шукаць, каб ухапіць дэфіцыт. Прабачце, але мне ўжо за 80 гадоў, я не магу бегаць па ўсіх кнігарнях, тым больш што жыву я ў раёне.

**— Зрабіць гэта можна ў адвольнай форме, — сказала начальнік аддзела маркетынгу выдавецтва «Беларусь» Марына ЛАНЦЭТАВА. — Неабавязкова пісьмова: прафесійны работнік гандлю, нават калі пра нешта толькі спыталі пакупнікі, пацікавіліся чым, павінен узяць такую інфармацыю сабе да ведама. З гэтых папярэдніх замоў і будзе потым сфарміраваная заяўка на наклад, што паступіць у канкрэтную краму. Без такіх заявак гандаль вельмі асцярожна бярэ прадукцыю, баючыся, што яна не будзе распрададзеная.**

А чаму б не арганізаваць падпіску на выданне «Родны край»?.. Дадаткова хацеў бы заўважыць, што не толькі адрыўных календароў не знайсці ў крамах, але і насценных табельных. Адно толькі, выручае газета «Звязда»: амаль на пачатку кожнага года друкуе ўкладышы з календарамі. Толькі пажадана лепш іх афармляць.

І яшчэ. Вы пішаце, што каляндар «Родны край» не разыходзіцца ў продажы і выдавецтва нясе страты. А чаму вы не друкуеце, колькі выдавецтва нясе стратаў ад календароў рускамоўных і колькі іх застаецца нерэалізаванымі? У любую кнігарню ці кіёск зазірні — аж вочы разбягаюцца ад розных назваў?».

Яшчэ больш эмоцый у лісце Міхаіла Сымонавіча Петрашкевіча з Іванава, які таксама піша, што згодны са спадаром Чарняўскім. Каб не паўтарацца, далей толькі па сутнасці. «У суботу 15 кастрычніка прайшоўся па рынку ў Іванава. Гандлююць календарамі ў трох месцах. У адным ляжаць аж 14 календароў! Няма месца толькі «Роднаму краю»! Спецыяльна зайшоў у адзіную дзяржаўную краму «Кнігі». Тут выбар меншы — усяго толькі восем назваў. Зноў няма «Роднага краю». На пытанне, калі будзе каляндар, адказ адзін: адкуль мы ведаем...»

Далей застаецца толькі дадаць, што спадар Петрашкевіч вядзе перамовы з юрыстамі аб падачы ў суд скаргі, што газета «Звязда» наўмысна распаўсюджвае хлуслівыя звесткі аб распаўсюджванні (так у лісце. — **С.Р.**) календара «Родны край»... Ні больш, як кажуць, ні менш.

Але пакінем эмоцыі «па-за кадрам» і пачнём ва ўсім разбірацца наноў і так падрабязна, наколькі гэта магчыма ў кантэксце скаргаў заяўнікаў, прычым, каб зняць усе чытацкія пытанні і цяпер, і надалей. Наконт «наколькі магчыма». І раней, і цяпер чытачы не паведамляюць канкрэтных назваў кнігарняў (хіба толькі зараз спадар Петрашкевіч згадаў дзяржаўную краму «Кнігі»). А яны могуць мець розную ведамасную падпарадкаванасць і ў кожным такім выпадку трэба звяртацца па каментар у канкрэтную арганізацыю ці ўстанову. З-за адсутнасці такіх звестак была дадзеная агульная інфармацыя пра наклад, магчымую цану. Прычым мы ніколі не пісалі, што ва ўсе крамы каляндар «Родны край» павінен быць завезены ў нейкі вызначаны дзень. Дзіўна, што даводзіцца тлумачыць, але гэта недзе можа быць раней, недзе — пазней. У нейкія кнігарні іх увогуле магло не паступіць, або паступалі яны ў невялікай колькасці і былі, напрыклад, распрададзеныя. Усё залежыць ад заявак самога гандлю. Спынімся на гэтым падрабязна.

Незадаволеныя чытачы пішуць скаргі ў «Звязду», размаўляюць з прадаўцамі. Але на маёй памяці не было ніводнага выпадку, каб я прачытаў, што чытач у пэўнай кнігарні пакінуў менавіта замову на «Родны край», а яе не выканалі! Не «высвятляў» адносіны з прадаўцамі, а менавіта замовіў сабе, сваім знаёмым патрэбную колькасць календара.

— Зрабіць гэта можна ў адвольнай форме, — сказала **начальнік аддзела маркетынгу выдавецтва «Беларусь» Марына ЛАНЦЭТАВА**. — Неабавязкова пісьмова: прафесійны работнік гандлю, нават калі пра нешта толькі спыталі пакупнікі, пацікавіліся чым, павінен узяць такую інфармацыю сабе да ведама. З гэтых папярэдніх замоў і будзе потым сфарміраваная заяўка на наклад, што паступіць у канкрэтную краму. Без такіх заявак гандаль вельмі асцярожна бярэ прадукцыю, баючыся, што яна не будзе распрададзеная.

Як бачыце, шаноўны Генадзь Пятровіч, вы цалкам маеце рацыю: вам не трэба «хуценька лётаць ды шукаць, каб ухапіць дэфіцыт». Гэта якраз варыянт своеасаблівай падпіскі на выданне. І мы пра тое неаднойчы пісалі, што трэба цікавіцца календаром у гандлі, але большасць чамусьці зразумела ўсё як патрэбу бегаць па крамах.

— Намі задаволеныя замовы ўсёй гарадской сеткі. Каляндар «Родны край» зараз ёсць у кнігарні ад выдавецтва «Беларусь», які размешчаны ў падземным пераходзе станцыі метро «Плошча Перамогі», — дадала Марына Леанідаўна.

**ААТ «Белкніга»** мае ў сваім падпарадкаванні большасць з дзейных кнігарняў па Мінску і Мінскай вобласці. **У гандлёвым аддзеле прадпрыемства** патлумачылі, што сёлета для продажу замовілі такую ж колькасць асобнікаў календара «Родны край», як і летась. «Кантынгент пакупнікоў гэтага календара параўнальна стабільны, ён асабліва не змяняецца за апошнія гады. Аднак у выпадку неабходнасці мы зможам дазаказаць у выдавецтва патрэбны наклад», зазначылі рэдакцыі. Тут жа пацвердзілі правільнасць дзеянняў грамадзян па афармленні папярэдняй замовы: адвольная форма. Адзінае, папярэдзілі нас, калі крама размешчаная ў сельскай мясцовасці, яна, хутчэй за ўсё, будзе належаць да сістэмы спажывецкай кааперацыі. Але і там павінны выканаць замову пакупніка: прывезці патрэбнае выданне і, калі тавар паступіць, папярэдзіць пра тое чалавека.

— Каляндар друкуецца штогод прыкладна ў адзін і той жа час — у верасні-кастрычніку. Таму свае папярэднія замовы пакупнікам лепш падаваць недзе летам, каб гандаль паспеў іх сфарміраваць агулам. Улічваючы пастаяннае кола спажыўцоў, што жадаюць набыць «Родны край», самі работнікі гандлю могуць нагадваць пра такую магчымасць людзям, — сказала Марына Ланцэтава.

Пра што яшчэ можна сказаць. Колькі слоў пра багацце выбару рускамоўных календароў. Не трэба забываць, што мы жывём пры рынкавых адносінах. Раз іх столькі відаў, значыць, яны карыстаюцца большым попытам і гандляры не баяцца рызыкаваць, заказваючы іх у такой колькасці. Тым больш, як вынікае з лістоў чытачоў («на рынку Іванава календарамі гандлююць у трох месцах»), многія з гэтых гандляроў — камерсанты. Якія канкрэтна выдавецтвы тыя календары выпускаюць, заяўнікі нам не паведамілі. Што дасць лічба іх магчымых стратаў, калі яны ёсць? Гаворачы пра страты пры выпуску «Роднага краю» выдавецтвам «Беларусь» мы заўважалі, што гэты каляндар адносіцца да сацыяльна-значнай літаратуры, якая датуецца з бюджэту, а не з кішэні якога прыватніка...

Напрыканцы апошняе. «Звязда» па вызначэнні не мае нічога супраць выпуску «Роднага краю». Наадварот, толькі вітае друкаваную прадукцыю на роднай мове і жадае, каб яе было як мага больш. А вось каб гэта сапраўды спраўдзілася, як мы неаднойчы пісалі, ёй у гандлі павінны цікавіцца найперш пакупнікі. Як гэта зрабіць правільна — спадзяёмся, канчаткова растлумачылі. Дарэчы, тое ж датычыцца не толькі аднаго «Роднага краю»...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## Извещение о проведении повторных аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке

| Предмет аукциона | лот № 1 | лот № 2 | лот № 3 | лот № 4 | лот № 5 | лот № 6 | лот № 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ул. Ленина, 42 площадью 0,0537 га | ул. Гоголя, 42, 42/1, 44 и 46/1 площадью 0,2950 га | ул. Комсомольская, 5, 7, 7/1 и 9 площадью 0,2416 га | территория бывшего в/г № 2 «Южный» площадью 8,8797 га | ул. Коммунистическая, 20 площадью 0,2580 га | ул. К. Маркса, 95 площадью 0,0460 га | ул. 17 Сентября, 39 и 41, и ул. Советских Пограничников, площадью 0,5931 га |
| Функциональное назначение земельного участка | Строительство и обслуживание административно-офисного здания с объектами торговли и соцкультбыта на 1 этаже | Строительство жилых домов с объектами соцкультбыта на 1 этаже | Строительство жилого дома с объектами соцкультбыта на 1 этаже | Строительство многоэтажных жилых домов повышенной комфортности | Строительство и обслуживание объекта административно-офисного назначения | Строительство и обслуживание объекта административно-торгового назначения | Строительство жилого дома с объектами соцкультбыта на 1 этаже |
| Срок аренды зем. участка | 5 лет | 5 лет | 5 лет | 5 лет | 5 лет | 5 лет | 5 лет |
| Объекты недвижимости, подлежащие сносу | - встроенные нежилые помещения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Ленина, 42; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан | - здания и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Гоголя, 42, 42/1 и 46/1; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан | - здания и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Комсомольская, 5, 7 и 9; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан | - здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» | - здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» по ул. Коммунистической, 20; - сооружения по ул. Ленина | - здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» по ул. К. Маркса, 95 | - здания и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. 17 Сентября, 39 и 41 и ул. Советских Пограничников; - встроенные жилые помещения и сараи, находящиеся в собственности граждан |
| **Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой.** | | | | | | | |
| Наличие инженерных коммуникаций на зем. участках | Централизованные водоснабжение, водоотведение, теплоснабжение и газоснабжение, электросети. | | | Электросети | Централизованные водоснабжение, водоотведение, теплоснабжение и газоснабжение, электросети. | | |
| Начальная цена продажи (руб.) | 17 261 186 | 74 301 958 | 55 590 033 | 1 483 104 521 | 85 842 521 | 15 217 969 | 146 647 931 |
| Сумма задатка (руб.) | 1 726 000 | 7 430 000 | 5 559 000 | 148 310 000 | 8 580 000 | 1 520 000 | 14 664 000 |
| Расх. по подг. земел.-кадастр. документации, тех. условий, АПЗ (руб.) | 3 209 628 | 5 890 116 | 5 890 116 | 4 591 398 | 5 236 639 | 3 479 946 | 8 533 594 |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям** | | | | | | | |
| Восстановительная (остаточная) стоимость нежилых объектов недвижимости, руб. | 43 489 485 | 5 021 967 | 65 959 082 | 3 522 682 742 | – | – | 16 544 338 |
| Рыночная стоимость нежилых объектов недвижимости, руб. | – | – | – | – | 127 891 787 | 382 419 000 | 74 398 420 |
| Рыночная стоимость жилых объектов недвижимости, рублей/площадь | 459 661 000 / 187,9 кв.м | 681 064 000 / 277,6 кв.м | 916 940 000 / 377,5 кв.м | – | – | – | 1 251 316 000 / 504,47 кв.м |
| Площади жилых помещений для возврата в гос. жил. фонд | – | 382,3 – 497,3 кв.м | 132,2 – 167,2 кв.м | – | – | – | 390 – 520 кв.м |

**Победитель аукциона обязан:**
**приступить к** освоению земельного участка в течение 6 месяцев с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений);
**передать** в коммунальную собственность г. Бреста для отселения граждан жилые помещения типовых потребительских качеств, в соответствии с пунктами 44-46 Положения о порядке учета граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставления жилых помещений государственного жилищного фонда, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29 ноября 2005 г. № 565 «О некоторых мерах по регулированию жилищных отношений» на условиях ранее заключенных договоров найма жилых помещений;
**предоставить** взамен жилых помещений, находящихся в собственности граждан, жилые помещения, равноценные по благоустройству, по общей площади не менее ранее занимаемых, расположенные на территории города, либо по желанию граждан выплатить денежную компенсацию за принадлежащие им на праве собственности жилые и нежилые помещения.
**Дополнительные условия для победителя торгов:**
**по лоту № 4 –** разработка проекта застройки квартала № 2 в р-не Южного городка на зем. участке S=26.11 га в течение нормативных сроков, предусмотренных законодательством, с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте;
**по лоту № 5 –** разработка и согласование в установленном законодательством порядке генерального плана объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями в течение 2-х месяцев с даты проведения аукционных торгов; здания и сооружения по ул. Коммунистической, 20 находятся в безвозмездном пользовании в Управлении Департамента исполнения наказаний МВД РБ по Брестской области до 31.01.2012 г. согласно договору от 01.02.2009 г. № 3-Б;
**по лоту № 6** здания и сооружения по ул. К. Маркса, 95 находятся в безвозмездном пользовании в УВД Брестского облисполкома до 30.01.2012 г. согласно договору от 01.02.2009 г. № 2-Б.

**Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».**

**Перечень документов, представляемый потенциальным участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка; **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом –** копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; **представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) –** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Задаток в размере до 10 % от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924. Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, на которых находятся объекты недвижимости, подлежащие сносу, вносят задаток в размере, установленном для объекта с наибольшей начальной ценой.

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона обязан:** ● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации, тех. условий и АПЗ; ● заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка и договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) после выполнения условий, связанных с изъятием земельного участка, в установленные законодательством сроки;● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений); ● по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Брестским горисполкомом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. Оплата за объект может быть произведена в рассрочку в соответствии с порядком, утвержденным решением горисполкома. **Победитель аукциона обязан** в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 25 ноября 2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 22.10.2010 г. до 19.11.2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46. Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by**

Дапамажы нашым птушкам

# МЫ СУПРАЦЬ ЗНІШЧЭННЯ КРЫЛАТЫХ МІГРАНТАЎ НА КІПРЫ

**СЁЛЕТА на Кіпры адзначана найгоршая сітуацыя з адловам і наступным забойствам птушак за апошнія гады, паведамілі рэдакцыі спецыялісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак БАЦЬКАЎШЧЫНЫ».**

Прадстаўнікі міжнароднай прыродаахоўнай арганізацыі BirdLife паведамляюць, што сёлета да канца верасня колькасць сетак для адлову птушак на Кіпры павялічылася на 140 працэнтаў, а выкарыстанне клею, якім пакрываюць галінкі дрэў і кустоў, — нават на 265 працэнтаў у параўнанні з леташняй восенню. Эколагі падлічылі, што колькасць знішчаных на Кіпры рознымі спосабамі мігруючых птушак за апошнія 5 гадоў была найбольшай менавіта ў 2009 годзе, калі **ўвосень было забіта больш за паўмільёна еўрапейскіх верабʼіных птушак**.

Мясцовыя «нарыхтоўшчыкі» птушак дзейнічаюць амаль адкрыта, бо невялікія штрафы, якія могуць прысудзіць за такую дзейнасць суды, застаюцца неэфектыўным стрымальным сродкам. Рэгіянальныя супольнасці Кіпра ў сваёй большасці падтрымліваюць гэтыя антыпрыродныя традыцыі, якія маюць даволі старажытныя карані. З забітых дробных птушак гатуюць мясцовыя «далікатэсы» — так званыя стравы ambelopoulia, якія шырока даступныя ў мясцовых рэстаранах і нават развозяцца «на дом» у асобных вёсках. Такая страва з 4 птушачак каштавала ў 2008 годзе каля 50 еўра.

Он-лайн подпісы, якія цяпер збіраюцца міжнароднай супольнасцю ў абарону птушак-мігрантаў, сурʼёзна ўспрымаюцца ўрадам Кіпра. На гэты час петыцыю супраць знішчэння птушак падпісалі ў Вялікабрытаніі 913 чалавек, у Германіі — 547, Грэцыі — 205, Італіі — 145.

Беларускія аматары птушак могуць і павінны сабраць больш подпісаў, каб наша меркаванне супраць жахлівых вычварэнстваў у дачыненні да птушак на Кіпры было пачутае. **Падпісаць петыцыю магчыма праз інтэрнэт: www.komitee.de/en/protest/protestmail-cyprus. Трэба выбраць са спісу, які выпадае: Mr./Mrs./Ms.: потым упісаць лацінкай сваё імя, прозвішча, вуліцу і дом-кватэру, паштовы індэкс, горад або вёску (+раён), краіну і свой е-мэйл.**

**Сяргей КУРКАЧ.**


## Закрытое акционерное общество «Сомбелбанк»

Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, д. 25
Телефоны: 328 65 82, 328 65 69

сомбелбанк
УСПЕХ – ЭТО ТОЛЬКО НАЧАЛО

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 1 октября 2010 | на 1 октября 2009 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 12 253,0 | 7221,7 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 4 551,6 | 3087,9 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | 4 990,7 | |
| | для торговли | 11031 | 3 | | |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | 4 990,7 | |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | | |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 32 156,3 | 23090,2 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 85 753,6 | 52882,7 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | | |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 2 642,7 | 1783,0 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 4 590,5 | 1619,6 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | 146 938,4 | 89685,1 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | | |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 9 474,6 | 1637,7 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 78 121,6 | 42681,8 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | | |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 602,3 | 805,6 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 88 198,5 | 45125,1 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 39 989,4 | 35589,1 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | | |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 10 332,2 | 5122,9 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 8 142,6 | 3709,3 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 275,7 | 138,7 |
| 24 | Всего капитал | 121 | | 58 739,9 | 44560,0 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 146 938,4 | 89685,1 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 20 698,4 | 10131,9 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 20 307,0 | 10777,2 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 1 октября 2010 | на 1 октября 2009 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 9 252,9 | 7270,1 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 5 580,5 | 3825,5 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 3 672,4 | 3444,6 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 18 131,1 | 9079,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 316,1 | 609,4 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 16 815,0 | 8470,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 2 455,4 | 1695,6 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | -0,8 | |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | | |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 1 652,4 | 1179,8 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 2 712,2 | 1453,4 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 12 242,3 | 7845,4 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 1 151,5 | 1288,3 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 2 465,4 | 1041,2 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 8 142,6 | 3709,3 |

Заместитель Председателя Правления — Т.Л. Даниленко
Главный бухгалтер — Е.М. Папушева

ЗАО «Сомбелбанк», лицензия № 25 от 13.11.2008 г., выдана НБ РБ, УНП 807000122.


Прафілактыка

# ПАГОРШЫЎСЯ ЗРОК? ХУТЧЭЙ ДА ДОКТАРА!

**ЗРОК — унікальны дар прыроды. Дзякуючы складаным фізічным і хімічным працэсам, што адбываюцца ў зрокавым аналізатары, мы можам бачыць святло і цень, адрозніваць усю разнастайнасць колеравай гамы, успрымаць абʼекты на рознай адлегласці ад вока, а таксама іх рух у полі нашага зроку. Некаторыя функцыі вока змяняюцца разам з ростам і сталеннем усяго арганізма. Фарміраванне органа зроку, развіццё і ўдасканальванне зрокавых функцый працягваецца да 16—18 гадоў. Далей ідзе перыяд адносна стабільнага зроку.**

## УЗРОСТАВАЯ ДАЛЬНАЗОРКАСЦЬ

Пачынаючы з 40 гадоў (а ў людзей з блізарукасцю — крыху пазней) у выніку ўшчыльнення хрусталіка і зніжэння эластычнасці яго капсулы адбываецца аслабленне функцыі вока прыстасоўвацца да фіксацыі зроку на розных адлегласцях. Гэтая зʼява называецца прэсбіяпія («старэчая дальназоркасць»). Праяўляецца яна цяжкасцю і нават немагчымасцю працы з абʼектам на блізкай адлегласці, часовым пагаршэннем зроку пры пераводзе позірку ўдалячынь, якое ўзнікае адразу пасля працяглай працы на блізкай адлегласці ад прадмета альбо ва ўмовах недастатковага асвятлення ці неадэкватнай карэкцыі (напрыклад, у чужых акулярах). Узнікаюць і даволі доўга захоўваюцца зрокавы дыскамфорт і зніжэнне вастрыні зроку пры пераводзе позірку з блізу ўдалячынь.



**Увага! Калі вы не носіце акуляры або кантактныя лінзы, не маеце ніякіх прыкметаў хваробаў вачэй, вас не непакояць ніякія болі і нязручнасці, вам неабходна праходзіць агляд вачэй:**
- **прынамсі адзін раз ва ўзросце ад 20 да 29 гадоў;**
- **прынамсі двойчы ва ўзросце ад 30 да 39-ці;**
- **кожныя два—чатыры гады ва ўзросце ад 40 да 64;**
- **два разы на год, пачынаючы з 65 гадоў.**

Спробы адтэрмінаваць момант звароту да спецыяліста для карэкцыі зроку прыводзяць да стомы вачэй ад зрокавай нагрузкі (астэнапіі). Пры гэтым могуць зʼявіцца галаўны боль, млоснасць, затуманьванне зроку, стомленасць і адчуванне цяжару ў вачах, пачырваненне і сверб павек, слёзацячэнне, пагаршэнне агульнага самаадчування.

### Што рабіць?

Калі ваша праблема з факусаваннем на блізка размешчаных прадметах пагаршаецца з вялікай хуткасцю, так, што вы не можаце чытаць або займацца карпатлівай работай; калі вам пастаянна хочацца працерці вочы і «наладзіць рэзкасць», тады вам неабходна звярнуцца да ўрача.

Самалячэнне, самастойны падбор акуляраў, набыццё іх у неспецыялізаваных пунктах, на рынку прыводзяць толькі да ўзмацнення вышэйпералічаных скаргаў. Своечасовы зварот да спецыяліста дапаможа выявіць прычыну немачы і правесці эфектыўнае лячэнне.

## СІНДРОМ СУХОГА ВОКА

Апошнім часам расце колькасць зваротаў да афтальмолагаў з гэтай прычыны, і, хутчэй за ўсё, віной таму кампʼютар, за якім офісныя работнікі праводзяць да 8 гадзін у суткі. Справа ў тым, што, гледзячы ў экран (кнігу), чалавек міргае ў тры разы радзей, і слёзная плёнка, якая служыць змазкай пры руху вочнага яблыка і ўтрымлівае ў сабе рэчывы, што сілкуюць рагавіцу і ахоўваюць вока ад хваробатворных мікробаў, перасыхае. Ускладняе становішча цыгарэтны дым, кандыцыянаванае паветра, а таксама натуральны працэс старэння (па меры старэння арганізм выдзяляе менш тлушчавага сакрэту, у выніку чаго паскараецца працэс выпарэння слёзнай плёнкі). Часта сухасць у вачах адчуваюць тыя, хто карыстаецца кантактнымі лінзамі: яны ўбіраюць у сябе слёзную плёнку. Таксама прычынай захворвання могуць быць некаторыя лекі, дэфіцыт вітаміну А, у жанчын у перыяд менапаўзы — гарманальныя змяненні. Пры сіндроме сухога вока, як правіла, узнікаюць сверб, смыленне, раздражненне і пачырваненне, расплывісты зрок (звычайна аднаўляецца пасля мірГання). Кампʼютар і тэлевізар гэтыя адчуванні толькі ўзмацняюць.

### Што рабіць?

- Ужываць дастатковую колькасць вадкасці.
- Часцей міргаць, асабліва гледзячы ў манітор.
- Ні ў якім разе не церці вочы — гэта ўзмацняе раздражненне.
- Пракансультавацца са спецыялістам: сіндром сухога вока можа перарасці ў значна больш сурʼёзнае захворванне.

## КАТАРАКТА

У норме хрусталік абсалютна празрысты. Аднак з узростам парушэнне яго сілкавання можа выклікаць устойлівае памутненне і пагаршэнне зроку. Развіццю захворвання садзейнічаюць дрэнны абмен рэчываў (у прыватнасці, пры цукровым дыябеце), таксічнае або траўматычнае ўздзеянне на вока, захворванні ўнутраных абалонак вока і інш.

У пачатковай стадыі захворвання перад вачыма назіраецца мільганне цёмных палосак, штрыхоў, плямаў. Пры позірку на крыніцы святла выява часта раздвойваецца. Паступова памутненне хрусталіка становіцца выражаным. Пры развітай катаракце вобласць зрэнкі шараватая, шаравата-белая або малочна-белая. Адначасова зніжаецца вастрыня зроку, пры поўнай катаракце чалавек распазнае толькі наяўнасць або адсутнасць святла.

### Што рабіць?

Лячыць. У цяперашні час хірургічная аперацыя зʼяўляецца асноўным метадам вяртання зроку пры катаракце.

## ГЛАЎКОМА

Гэтае захворванне ўзнікае ў выніку парушэння цыркуляцыі ўнутрывочнай вадкасці, з-за чаго павышаецца ўнутрывочны ціск і развіваецца атрафія зрокавага нерва.

Глаўкома прагрэсуе непрыкметна. Адчувальныя праявы, як правіла, зʼяўляюцца на тым этапе, калі зрок аднавіць ужо складана. Развіццё глаўкомы вядзе да неабарачальнага працэсу частковай або поўнай страты зроку.

### Што рабіць?

Неадкладна звяртацца да доктара, выявіўшы ў сябе наступныя сімптомы:
- паступовае зніжэнне палёў зроку, спачатку страта перыферычнага, а затым і пагаршэнне цэнтральнага зроку;
- часовае ўзнікненне заслоны перад вокам, зʼяўленне вясёлкавых кругоў вакол крыніцы святла;
- прыступы рэзкіх галаўных боляў, пасля якіх затуманьваецца зрок;
- пачырваненне вочнага яблыка.

Цалкам аднавіць зрок пры глаўкоме на сёння, на жаль, немагчыма. Аднак своечасовы зварот да спецыяліста і наступнае лячэнне змогуць нармалізаваць унутрывочны ціск і прадухіліць або прыпыніць далейшае пашкоджанне нерва і развіццё слепаты.

## ДЫЯБЕТЫЧНАЯ РЭЦІНАПАТЫЯ

Разам з пашкоджаннямі нырак і сасудаў ног пры цукровым дыябеце адбываецца і незапаленчае пашкоджанне сеткаватай абалонкі вочнага яблыка. Сятчатка вока пазбаўляецца сілкавання. У ёй узнікаюць ацёкі, кровазліцці, адкладваюцца прадукты абмену рэчываў. Пры дыябетычнай рэцінапатыі гінуць нервовыя клеткі, развіваюцца анамальныя сасуды, з якіх адбываюцца масіўныя кровазліцці. Такія змяненні часта незваротна зніжаюць зрок.

### Што рабіць?

У большасці з тых, хто хварэе на цукровы дыябет не менш як 10 гадоў, ёсць тыя ці іншыя формы пашкоджання сятчаткі. Паколькі працэс гэты праходзіць бязбольна, зніжэння зроку можна і не заўважыць. Але зʼяўленне плаваючых цёмных плямаў і заслоны перад вачыма — гэта прычына для хвалявання і тэрміновага звароту да афтальмолага. У астатнім жа старанны кантроль узроўню глюкозы ў крыві, захаванне неабходнай дыеты і здаровы лад жыцця дазваляюць зменшыць рызыку слепаты ад вочных ускладненняў дыябету. І, зразумела, абавязкова строгае захаванне перыядычнасці аглядаў вочнага дна ў спецыяліста.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.50 | 17.57 | 10.07 |
| Віцебск — | 7.43 | 17.44 | 10.01 |
| Магілёў — | 7.40 | 17.47 | 10.07 |
| Гомель — | 7.34 | 17.47 | 10.13 |
| Гродна — | 8.05 | 18.13 | 10.08 |
| Брэст — | 8.02 | 18.16 | 10.14 |

### Месяц

*Поўня 23 кастрычніка.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.** Афанасіі, Абрама, Канстанціна, Максіма, Пятра, Якава.*

***К.** Лідзіі, Саламеі, Аляксандра, Марка, Філіпа.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.







## 22 кастрычніка

**1944 год** — у Мінску адбылося афіцыйнае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (заснаваны 30 верасня 1943 г.) Першай экспазіцыяй былі дзве выставы: «Зброя» і «Партызанскі друк», матэрыялы якіх змяшчаліся ў 15 залах і ўтрымоўвалі 1261 экспанат: лістоўкі, газеты, рукапісныя часопісы, фатаграфіі, узоры зброі. Стацыянарная экспазіцыя адкрылася ў 1947 годзе. Асноўны фонд музея складаюць больш як 104 тысячы адзінак захоўвання. Экспазіцыя размяшчаецца ў 26 экспазіцыйных і 2 выстаўных залах. Аснову экспазіцыі складаюць прадметы, сабраныя супрацоўнікамі музея ў перыяд баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі, Усходняй Еўропы і Германіі, а таксама перададзеныя пасольствамі розных краін у паваенны час.



**1797 год** — у Парыжы зроблены першы ў свеце скачок з парашутам з паветранага шара.




***«Доля глыбокай старасці абодвух палоў залежыць ад таго, на што патрачана маладосць».***

**Стэндаль (1783 — 1842), французскі пісьменнік.**

## МАЛАДЫЯ НАВЕДВАЮЦЬ ПАМЯТНЫЯ МЕСЦЫ

**Адразу ж пасля вянчання або рэгістрацыі шлюбу вясельны картэж накіроўваўся да могілак. Сёння сучасная моладзь едзе або ідзе да мемарыяльных комплексаў ці іншых памятных месцаў, звязаных з гісторыяй ці культурай пэўнага рэгіёна.**

- Гэта традыцыя ўвабрала ў сябе светапоглядныя ўяўленні розных гістарычных эпох. Яе сацыякультурнай асновай зʼяўляецца прынцып шанавання продкаў, які ў кантэксце большасці каляндарных і сямейна-радавых святаў займае дамінантнае становішча. У народнай свядомасці ён сфакусіраваны ў простай і зразумелай формуле: «Перш чым сабе — продкам». Веды гэтага сімвалічнага ключа даюць магчымасць зразумець сэнс традыцыі наведваць памятныя мясціны. У ранейшыя часы свет продкаў знаходзіўся ў непасрэднай блізкасці ад свету жывых. Як правіла, у непасрэднай блізкасці ад царквы размяшчаліся могілкі. Зразумела, што маладыя адразу ж пасля шлюбу ішлі наведаць магілы сваіх дзядуляў і бабуль. І толькі пасля гэтага вясельны картэж вяртаўся дахаты. У савецкі час і, асабліва ў пасляваенны перыяд, калі ролю храма сталі выконваць аддзелы загсаў, гэтая традыцыя атрымала некалькі іншае асэнсаванне, хоць у яе аснове па-ранейшаму ляжыць найстаражытны пачатак: пасля рэгістрацыі шлюбу маладыя адпраўляліся да мясцовых святынь, да брацкіх магіл, да месцаў рытуальнага пахавання нашых продкаў.
- Не забудзьцеся: калі ў кагосьці з маладых няма бацькі ці матулі, могілкі неабходна наведаць перад рэгістрацыяй шлюбу, каб «заручыцца» падтрымкай і благаслаўленнем.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Віншуем дарагую і любімую
**Любоў Дзмітрыеўну БАДЗЕЙ з юбілеем.**
Жадаем здароўя, шчасця і любові.
**Муж, дзеці, нявесткі, унучка.**

## Усміхнемся!

Мама сыну:
— Так, Вовачка, мы цябе распесцілі... Напэўна, прыйдзецца цябе пакараць!
— Як гэта: ВЫ распесцілі, а МЯНЕ караць?

☺

**Паставога міліцыянера галубы павысілі ў званні.**

☺

Маладзенькая медсястра пытаецца ва ўрача:
— Павел Фёдаравіч, а мы наогул — хуткая дапамога?
— Вядома, Танечка!
— А чаму ж мы сёння нікому не дапамаглі?
— Затое праехаліся хутка!

☺

**Чалавеку не дадзена зразумець тры рэчы: Бога, Сусвет і нашых будаўнікоў, якія прыдумалі сцяну, праз якую ўсё чуваць, але цвік у якую забіць немагчыма!**

☺

— Хлопцы, бяжыце! Я іх затрымаю!
— Але ж у цябе ж няма пісталета!
— Затое ў мяне ёсць крыжаванкі і семкі!

☺

**Настаўніца рускай мовы, якая ўпершыню скокнула з парашутам, была ўзрушаная, здзіўленая, вельмі збянтэжаная, але ўголас крычала па-іншаму.**




МТС — аграгарадкам

# АБЛАСНЫЯ «ДАЖЫНКІ» Ў ЦІХАЙ ГЛЫБІНЦЫ



Ці ведаеце вы, што фестываль-кірмаш сёлета праходзіў не толькі ў Лідзе? На Віцебшчыне абласное свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі» адбылося ў Расонах. Бадай, упершыню «губернскія» «Дажынкі» ладзіліся з размахам і маштабам. А гарадскі пасёлак Расоны з насельніцтвам крыху больш за 5,1 тысячы чалавек атрымаў з гэтай нагоды шмат падарункаў, якімі будуць і надалей карыстацца ўсе тутэйшыя і прыезджыя з суседніх і далёкіх гарадкоў і вёсак.

Маштабная акцыя прысвячалася, вядома, у першую чаргу перадавым механізатарам, вадзіцелям, спецыялістам і кіраўнікам, якія працавалі на жніве гэтага года лепш, чым іх калегі. Каб апошнім было з каго браць прыклад і было да чаго імкнуцца. Пераможцаў спаборніцтва па ўборцы збожжавых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы кармоў павіншаваў і падзякаваў ім за добрую працу асабіста старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец. Працавітыя людзі атрымалі грашовыя прэміі і тэлевізары.

Праверана: на працягу ўсяго маршруту з Віцебска ў Расоны сувязь вядучага мабільнага аператара нашай краіны МТС дзейнічае, як кажуць, на ўсе сто. Нягледзячы на тое, што падчас свята колькасць званкоў у сетцы МТС намнога павялічылася, ніякіх збояў пры выхадзе на сувязь і пры прыёме званкоў не было.

Па галоўнай вуліцы пасёлка ў суправаджэнні аркестра прайшліся дэлегацыі ад кожнага раёна вобласці. На плошчы спецыяльна для «Дажынак» збудавалі часовую канцэртную залу. Галоўныя героі свята выходзілі на сцэну, каб пачуць словы ўдзячнасці ад губернатара.

На свята была запрошаная фактычна эліта аграрнага сектара Віцебскай вобласці, а таксама ветэраны, заслужаныя аграрыі-пенсіянеры і гэтак далей. Артысты — самадзейныя і прафесійныя (нават «зоркі» эстрады са сталіцы) — ад душы пастараліся, каб паважаныя гледачы не сумавалі. Прыпеўкі, танцы, лірыка — усе гэтыя выступленні заканчваліся шквалам апладысментаў.







Пад гукі канцэрта ў пасёлку кіпела святочнае жыццё. Куды ні зірні, паўсюль нешта адбывалася. Тутэйшыя і прыезджыя з задавальненнем хадзілі між прыгожа аформленых гандлёвых радоў. У гэты дзень для пакупнікоў быў вельмі багаты выбар, былі б толькі грошы. Прадавалі мясную і малочную прадукцыю, гародніну, грыбы, ягады... Цудоўна былі аформлены вулічныя кавярні і корчмы, якія зманціравалі і паадкрывалі ў такой колькасці, што кожнаму знайшлося месца ля прылаўка і за столікам.

Умельцы прадставілі на кірмашы ў «Горадзе майстроў» свае вырабы з лазы, дрэва, металу, керамікі. Дзятву прывабліваў шэраг новай сельскагаспадарчай тэхнікі. Дарэчы, у гонар «Дажынак» Расонскі раён атрымаў у дар усе гэтыя новыя машыны сельскагаспадарчага прызначэння. А райцэнтр цяпер мае адноўлены Дом культуры, сучасны фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Шмат чаго зрабілі для добраўпарадкавання гарадскога стадыёна...

«Дажынкі» ў глыбінцы атмасферай свята нагадалі мне знакаміты віцебскі музычны «кірмаш». Нафатаграфаваў на «Дажынках» так шмат, што нават спатрэбіліся дадатковыя батарэйкі для камеры. Шчыра прызнаюся: так спадабалася на свяце, што ехаць дамоў вельмі не хацелася.

«Дык заставайцеся!» — пажартавалі знаёмыя жыхары раёна. Мо і застаўся б, каб не жыццёвыя акалічнасці. Так што прыязджайце сюды і вы. І будзьце ўпэўнены: з МТС вы заўсёды застанецеся на сувязі ў кожным кутку Беларусі і ў цэлым шэрагу краін за яе межамі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Расонскі раён.**
**Фота аўтара.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.**
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5160. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12